Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц . . . . — 90 к. • 3 • . . . . 2 р. 70 к. • 6 • . . . . 4 р. — к. • 1 год . . . . 8 р. — к. Зьмена адрасу: іншагародняя — 20 к., мясцовая . . — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок шапарэлі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок шапарэлі пасьлядо тэксту 1 р. — к. За радок шапарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьпешныя на 50 проц. даражэй. Зьмы тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумант . . . 25 кап. За кожны дадатковы . . 15 „ Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант . . 15 „ За кожны дадатковы . . 5 „ Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 237 (2425) Субота, 13-га кастрычніка 1928 г.

Пахаваньне тав. Скварцова-Сьцяпанава.

ПРОВАД ДА КРЭМАТОРЫЯ.

МАСКВА, 11-Х. У апошняй зьмене ганаровае варты ў Доме Саюзаў ля труны т. Скварцова-Сьцяпанава стаялі Ляжава, Лобаў, Сьвідэрскі і Гурэвіч.

Упоўнач труну з целам выносяць Бубноў, Энукідзэ, Досаў, Дзержынскі і Савельлеў і стаўляюць на аўтамабіль абвіты чорнымі палотнішчамі. Жалобная працэсія разам з ганароваю вайсковаю вартаю—кавалерыйскім эскадронам,—накіроўваецца ў крэматоры, дзе цела было спалена.

Апошняе разьвітаньне з нябожчыкам.

МАСКВА. 11 кастрычніка на працягу ўсяго дню да 11 г. 30 хвіл. ночы праз малую залю Дому Саюзаў, дзе знаходзіцца труна з целам Скварцова-Сьцяпанава, прайшло некалькі дзесяткаў тысяч чалавек, жадаўшых аддаць апошні доўг нябожчыку. Ля труны праз увесь час зьменьваецца ганаровая, вайсковая і цывільная варта. На працягу 13-ці гадзін ля труны стаяла больш 125 зьмен ганаровае варты.

Ушанаваньне памяці нябожчыка на Украіне.

ХАРКАЎ, 10-Х. У зялікім прэзыдыуме Всеўкраінскага ЦВК т. Петроўскі перад пачаткам пасяджэньня зьвярнуўся да членаў прэзыдыуму з прамовай, у якой характарызаваў выдатную асобу нябожчыка Скварцова-Сьцяпанава.

Прэзыдыум пастанавіў выказаць з прычыны сьмерці т. Скварцова-Сьцяпанава шчырае спачуваньне ЦВК СССР, ЦК УсеКП(б) і сям'і нябожчыка.

Замест вянка пастаноўлена перадаць у ФОНД ІМЯ СКВАРЦОВА-СЬЦЯПАНАВА—500 руб. і пасвяціць у залі пасяджэньняў ЦВК партрэт нябожчыка. Пастаноўлена такоамама заснаваць у вышэйшых сацыяльна-эканамічных навучальных установах Украіны пяць стыпэндый павышанага памеру імя нябожчыка і назваць яго імем адну з будуемых на Украіне электрастанцыю.

Тэмп гаспадарчага разьвіцьця СССР.

Абмеркаваньне кантрольных лічбаў 1928-29 г. на зьезьдзе дзяржплянаў).

МАСКВА, 11-Х. На зьезьдзе дзяржаўных плянавых камісій з дакладам аб кантрольных лічбах народнае гаспадаркі СССР на 1928-29 г. выступіў т. Грэнько.

Аналіз фактычнага выкананьня кантрольных лічбаў 1927-28 г. паказвае, як—зазначыў дакладчык,—што кантрольныя лічбы вострa недалічылі вытворчых магчымасьцяў нашае прамысловасьці і, разам з тым, пераацанілі магчымасьці разьвіцьця сельскае гаспадаркі. Па прамысловасьці кантрольныя лічбы намячалі рост проці папярэдняга году на 14 проц., фактычна-ж мы маем рост НА 21 ПРОЦ. Адначасна рост валавае прадукцыі сельскае гаспадаркі меркаваўся на 4 проц., а фактычна прадукцыі атрымана на 2,7 проц. менш. Такім парадкам, не зважаючы на вышэйзгадзеныя ўраджаі, рэсурсы сельскае народнае гаспадаркі ў кантрольных лічбах на 1927-28 г. былі пераацэнены. Не апраўдаўся таксама намечаны кантрольнымі лічбамі ўзьвышны рост дробнае саматужнае і прыватнае прамысловасьці. Наадварот, на-проць плянаваньня, дробная саматужная і прыватная прамысловасьць крыху скарацілася за кошт больш інтэнсыўнага, чымся намячалася, росту буйнае дзяржаўнае прамысловасьці.

Выдатак апалу ў СССР узрос за гэты год на 13 проц., у той час, як выраб і загатоўка яго ўзрасьлі толькі на 8 паловаю проц. Такім парадкам, тут намечаныя кантрольнымі лічбамі запасы апалу зрабіць не ўдалося. Тэмп росту чорнае мэталюргіі ўсё ніжэй адстае ад машынабудаўніцтва і адгул ад цяжкае індустрыі: мэталюргія дала росту 12 з паловаю проц., а машынабудаўніцтва—21 проц. Выраб дзяўнічых матар'ялаў хоць і ўзрос, але значна адстае ад росту будаўніцтва. Лік рабочых павялічыўся не на проц., а на 8 проц. Выпрацоўка на аднаго рабочага ўзьнялася на 14 з паловаю проц., замест намечаных 17,2 проц., заработак павялічан на 10 з паловаю проц. проці 7,25 і г. д. Невыкананы прамысловасьцю тэмп пляновыя меркаваньні ў галіне зьніжэньня сабекошту.

Асаблівасьцю кантрольных лічбаў 1928-29 г. зьяўляецца арыентыроўка на больш высокія тэмпы росту сельскае гаспадаркі. Гэты рост намечан ня толькі за кошт павялічэньня засеўнае плошчы, але і за кошт павялічэньня ўраджайнасьці. Між іншым, рост засеўнае плошчы намечан у 6-7 проц.

Валавая прадукцыя ўсяе прамысловасьці за год павінна павялічыцца, водлуг меркаваньняў Дзяржпляну СССР, НА 15 ПРОЦ.

Калі ў мінулым годзе выраб рэчаў спажываньня ўзрос больш, чымся выраб сродкаў вытворчасьці, дык сёлета рост цяжкае індустрыі намечан у 15,9 проц., а лёгкае—13,8 процантаў. Агульны рост хэмічнае прамысловасьці намечан 34 проц., проці леташніх 21 проц.

Галоўнаю задачаю надыходзячага году зьяўляецца зьніжэньне сабекошту прамысловае прадукцыі. Сабекошт павінен быць зьніжан на 10 проц. Такое зьніжэньне дзяржаўная плянавая камісія лічыць магчымым, бо за апошні год у прамысловасьць укладзена больш 3-х міліярдаў рублёў, а ў 1928-29 г. капітальныя ўклады ў прамысловасьць дасягнуць 4,5 міліярдаў рублёў.

Агульны лік прамысловых рабочых намечана прывесьці ў адпаведнасьць з патрэбамі прамысловасьці. Значна пашыраецца забясьпечаньне рабочых па старасьці: на працягу 1928-29 г. мяркуецца перавесьці на пэнсію 80 тысяч старых рабочых. Бюджэт сацыяльнага страхаваньня павялічваецца на 17 проц., фонд дапамогі беспрацоўным павялічваецца на 30 міліёнаў рублёў і г. д.

Перад намі—кажа, урэшце, Грэнько—стаяць вялічэзныя задачы. Але, маючы за сабою актыўную дапамогу шырокае грамадзкасьці, верачы ў творчыя сілы пралетарыяту, мы маем усе падставы спадзявацца, што намечаны плян разьвіцьця народнае гаспадаркі краю будзе выканан.

ЗАНЯПАД АНГЕЛЬСКАГА ЗАМЕЖНАГА ГАНДЛЮ.

ПАГРОЗА НОВАГА РОСТУ БЕСПРАЦОЎЯ.

ЛЁНДАН. 11-Х. Замежны гандаль Англіі ў верасьні востра зменшыўся. У параўнаньні з верасьнем 1927 г. прывоз зменшыўся прыблізна на 14 міліёнаў фунтаў стэрлінгаў, вываз—на 4 міліёны фунтаў стэрлінгаў. Гэта выклікала вялікую трывогу. Становішча лічыцца тым больш сур'ёзным, што абароты замежнага гандлю ў верасьні звычайна павялічваюцца.

Гандлёва-прамысловыя колы непакоюцца, што скарачэньне прывозу сыравіны выкліча новы рост беспрацоўя.

АГАЛАШЭНЬНЕ ЗГОДЫ ЗАТРЫМЛІВАЕЦЦА.

ЛЁНДАН, 10-Х. Агенцтва Рэйтэра паведамляе: «Міністэрства замежных спраў заяўляе, што яно ўжо атрымала меркаваньні ўсіх дзяржаў, якія былі паведамлены ўмовы англа-французкае марское згоды. Адказы ўрадаў будуць агалошаны, як толькі будзе прыслана згода зацікаўленых дзяржаў».

КАЗЁННЫЯ УРАЧЫСТАСЬЦІ У ПЕКІНЕ.

«ПАТРАБУЕМ АДМЯНІЦЬ НЕПАСІЛЬНЫЯ ПАДАТКІ».

ПЕКІН. 10-га кастрычніка адбылося сьвяткаваньне 17-х угодак паўстаньня рэвалюцыйнага войска ў Кітае.

Гэты час лічыцца пачаткам кітайскае рэвалюцыі. У гэты дзень у 1911 годзе рэвалюцыйнае войска разьбіла ў Кітае атрады, якія заставаліся вернымі багдыхану.

Адбыўся масавы мітынг. Увечары ў вуліцах прайшла працэсія з каляровымі ліхтарамі. Дэманстранты несьлі плякаты. Пераважалі лёзунгі: «Няхай жыве Гаміндан», «скончым рэвалюцыю», «патрабуем адмяніць цяжкія падаткі».

КОНТР-РЭВАЛЮЦЫЯ ПАД РЭВАЛЮЦЫЙНАЮ МАСКАЮ.

ШАНХАЙ. У часе цэрамоніі ўступу Чан-Кай-Шы на пасаду старшыні нанкінскага ўраду зачытаны прывітальныя тэлеграмы прэзыдэнта Злучаных Штатаў Куліджа і большасьці прадстаўнікоў дзяржаў у Пекіне. Чан-Кай-Шы прысягнуў выконваць вучэньне Сун-Ят-Сэна і дырэктывы Гаміндану. Ён зьвярнуўся да народу з лістом, у якім заазначана, што дзеля дабрабыту нацыі і дасягненьня незалежнасьці патрэбна адмова «ад лжэвучэньня аб няўхільнасьці барацьбы клясаў».

Нацыянальны ўрад прапануе Чжан-Сюэ-Ляну прыехаць у Нанкін і афіцыйна заняць пасаду сябра дзяржаўнае рады.

Да лодзінцаў далучаюцца тэкстылі Варшавы.

СЁНЬНЯ ПАВІННА АДБЫЦЦА АБВЯШЧЭНЬНЕ ЎСЕАГУЛЬНАЕ СТАЧКІ. —МЕНШАВІКІ „ЧАКАЮЦЬ" ДАПАМОГІ АД РЭФАРМІСТАЎ ЗАХАДУ.

На фабрыках Лодзі зьнят тэхнічны нагляд.

ВАРШАВА. 11-Х. З учарайшага дню забастоўка ў Лодзі яшчэ больш пашырылася. Зьняты з працы машыністы і качагары, а таксама вартаўнікі фабрык і фабрычных складаў.

Настрой рабочых рашучы. Чакаюць, што ўсеагульная забастоўка будзе абвешчана 13-Х.

Лодзінская газэта «Рэспубліка» зьвярнулася да кіраўнікоў прафсаюзаў з запытаньнем, што яны будуць рабіць, калі ня стане статачнага фонду. Кіраўнік так званага «клясавага прафсаюзу» меншавік Вальчак адказаў, што саюз зьвернецца за дапамогаю да лёндонскага інтэрнацыяналу тэкстыльшчыкаў і да тэкстыльшчыкаў іншых краёў, апроч СССР. Казімірчык, кіраўнік саюзу нацыянальнае рабочае партыі заявіў, што давядзецца зьвярнуцца за дапамогаю да лодзінскага муніцыпалітэту, які не павінен адмовіць, бо ім кіруюць меншавікі.

У Варшаве забаставалі 2 тэкстыльныя фабрыкі, *рабочыя якіх патрабуюць 20 проц. прыбаўкі. Апроч таго, у самай* Лодзі трамвайныя рабочыя, *ідучы па прыкладу мэталёўцаў, высунулі эканамічныя патрабаваньні і пагражаюць забаставаць 14-га кастрычніка.*

Глыбокі крызіс ППС.

НАПЯРЭДАДНІ ФАРМАЛЬНАГА РАСКОЛУ Ў ПАРТЫІ.

ВАРШАВА, 11-Х. Выхад першага нумару газэты «Пшэсквіт» (Сьвітаньне») якая выдаецца групаю Марачэўскага (ранейшы лідэр ППС, зараз—міністр грамадзкае працы і прыхільнік супрацоўніцтва з Пілсудскім) зрабіў у палітычных колах вялікае ўражаньне. Першы нумар газэты быў літаральна расхоплен за некалькі гадзін.

Афіцыйны орган ППС «Роботнік» спаткаў выхад газэты вострым артыкулам. Газэта абвінавачвае Марачэўскага ў тым, што ён у ганьбу сябра ўраду падпісаў дэкрэт наконт—друку, канфіскаваў рабочы друк і «праводзіў падвойную гульню з соймам". Газэта намякае на атрыманьне новаю газэтаю ўрадавае субсыдыі.

«Пшэсквіт» зараз-жа адгукнуўся на выступленьне «Роботніка». Рэдакцыя «Пшэсквіта» дэманстрацыйна заяўляе, што газэта заснавалася пад уплывам пілсудчыкаў. „Мы адарваліся ад партыі,—піша газэта—бо ня можам больш маўчаць, бо нельга даверыць справу сацыялізму і ППС маленькім людзям, якія не дарасьлі да кіраўніцтва». У адказе на запытаньне «Роботніка»: хто фінансуе „Пшэсквіт", газэта піша: „У памышканьні шыбальніка не гаворыць пра вяроўку. Відома, што „Роботнік" мае дэфіцыт, і што дэфіцыт пакрываецца ўрадавымі абвесткамі і прыбыткамі ад друкаваньня друкарняю ППС урадавага органу „Месяцэ Полёвэ".

У палітычных колах на сёньня—зьўтра чакаюць расколу партыі.

ПЕРАД РАЗВАЛАМ ППС.

«Гэзэта Варшавска» [№ 301] піша аб развале ў ППС наступнае: «10 кастрычніка вечарам зьявілася новая сацыялістычная газэта пад назвай «Пшэсквіт». Рэдагуе яе б. т. Леон-Болеслав Чаркоўскі, даўні сатаварыш і супрацоўнік т. Зюка-Юзэфа Пілсудзкага, з часоў яго дзейнасьці ў баявой арганізацыі ППС. Як паведамляецца ў анонсах, бліжэйшым супрацоўнікам «Пшэсквіту» мае быць Андрэй Марачэўскі.

Гэтая група, якая імкнецца да стварэньня так. зв. народных сацыялістаў, узяла назву даўняга месячніка ППС, выдаванага ў Лёндане і Кракаве, і выступае проці афіцыяльнага кірунку партыі.

Роля пасла Явароўскага ў гэтай новай афэры яшчэ на зусім ясная»...

Міжнародная канфэрэнцыя ў справе Віленшчыны.

Ковенскі карэспандэнт «Фосьсішэ Цэг» паведамляе, што ўрадавыя літоўскія сфэры разглядаюць праэкт скліканьня міжнароднай канфэрэнцыі з удзелам СССР для высьвятленьня віленскай справы.

Разам з гэтым газэта паведамляе, што літоўскі ўрад абвясьціў пастанову францускіх юрыстаў Ляпрадэля, Ле-Фура і Мандэльштама, прызнаўшых, што так-званы «Савет паслоў» ня меў права захопленую Жэлігоўскім Віленшчыну аддаваць Польшчы.

За што сканфіскавалі № 10 „Маланкі"?

Рэдактар сканфіскаванага гэтымі днямі № 10 бел. гумарыстычнай часопісі „Маланка" даведаўся ў Віленскім гарадзкім старостве, што памянёны № сканфіскаваны за верш Янкі Купалы «Песьня для некаторых маладых людзей» і клішэ з подпісам «Дзьве дарогі». «Характэрна адзначыць—кажа «Слова Працы» (№ 2),—што гэты верш Янка Купала напісаў у 1906 годзе і друкаваў у сваім зборніку вершаў «Жалейка» ў 1908 годзе, гэта зн. у часе найбольшай царскай рэакцыі і... царская цэнзура гэты верш не сканфіскавала».

Адсюль вывад—панская цэнзура куды «лепшая», ніж нават царская.

РАСПУСЬНІК У АРЦЫБІСКУПСКАЙ СУТАНЕ.

ВАРШАВА, 11-Х. Польскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе: «Сёньня ўночы ў Плоцку скончыўся працэс галавы каталіцкае сэкцыі «марыністаў» арцыбіскупа Кавальскага, абвінавачанага ў антымаральных злачынствах. Працэс выклікаў вялікую цікавасьць ва ўсёй Польшчы. Суд прызнаў Кавальскага вінаватым і засудзіў яго, з прыстасаваньнем амністыі, на 2 гады і 8 месяцаў зьняволеньня ў папраўчым доме.

Кавальскі часова пакінут на волі пад заклад.

Арышт камуністаў.

«Дзеньнік Віл.» (№ 232) паведамляе, што ў райёне Радашковічі паліцыя арыштавала 4 камуністых і быццам знайшла ў іх камуністычныя дакументы.

Арышт зладзеяў-рэцыдывістаў.

Гэтымі днямі, паліцыя арыштавала ў Вільні нейкага П. Бярнатовіча, б. судоваго ўрадоўца, і В. Даўнаровіча, агранома. Яны сфальшавалі дакумант, на аснове якога хацелі атрымаць у адным з віленскіх банкаў 40000 злотых, а потым зьбегчы заграніцу. Арыштаваных пасадзілі ў Лукіскі астрог.

Забастоўка каменшчыкаў у Кракаве.

8 кастрычніка г. г. у Кракаве выбухла забастаўка каменшчыкаў, якія вымагаюць падвышкі платы.

Крадзеж у паштовай касе.

9 кастрычніка г. г. у Лашыцах, Пастаўскага пав. [Зах. Беларусь], невядомыя асобы ўламаліся праз вакно ў паштовую касу, адкуль забралі некалькі сот злотых і вялікую колькасьць паштовых марак.

Уцечка „грознага бандыта" з поезда.

«Кур'ер Віл.» (№ 232) паведамляе, што між станцыямі Скідэль-Жыдомля выбег з поезду грозны бандыт Юры Ломуць, якога везьлі в Навагрудка ў Горадню на суд. Каля 5 гадзіны раніцы Ломуць скарыстаў з часовай нуваги паліцыянта, ссунуў з рук кайданы і ўдарыў паліцыянта так моцна, што агушыў яго і, кінуўшыся ўцякаць, выскачыў на ходу з поезда і зьбег. За розныя свае падзеі ў Нясьвіцкім павеце Ломуць раней быў прысуджан на 15 гадоў катаргі.

Выбары ў касы хворых у Літве.

8 кастрычніка г. г. адбыліся першыя ў Літве выбары ў касы хворых. Работнікі выбралі 10 эсэраў, 6 левых дэмакратаў, 2 членаў правай фракцыі, 12 беспартыйных. У выбарах прымала ўдзел толькі 30 проц. рабочых.

Пры выборах фашысты ўжывалі ўсялякія спосабы, каб не даць магчымасьці выбраць у касу хворых камуністаў і нагоул левых.

ТАВ. ЭНУКІДЗЭ АБ АРГАНІЗАЦЫЙНЫХ ЗАДАЧАХ ПЕРАВЫБАРАЎ.

(З заключнага слова на усесаюзнай перавыбарчай нарадзе).

Рэвізійныя камісіі пры выканкомах павінны стаць грамадзкімі арганізацыямі, цесна зьвязанымі з гушчамі выбаршчыкаў.—Ніякіх зьмен нормаў прадстаўніцтва ў саветы.

МАСКВА. 11-га кастрычніка на ранішнім пасяджэньні нарады па пытаньнях перавыбарчае кампаніі спрэчкі па дакладах т. т. Кагановіча і Энукідзэ былі скончаны.

У заключным слове т. Энукідзэ спыніўся на некаторых найбольш сур'ёзных пытаньнях, закранутых у спрэчках.

Такім зьяўляецца, напрыклад, пытаньне аб рэвізійных камісіях. Каб рэвізійныя камісіі не гляндзелі толькі за фінансавай справаздачнасьцю выканкомаў, але і зрабіліся грамадзкімі арганізацыямі і адэньвалі працу саветаў па сутнасьці, а не фармальна, дык павінна быць узмоцнена сувязь між імі і жыхарствам. З гэтае прычыны павінна быць зьвернута вялікі сур'ёзная ўвага на падбор працаўнікоў у гэтыя камісіі. Каб узьняць аўтарытэт рэвізійных камісій, было-б пажадана абіраць іх непасрэдна на выбарчых сходах, каб выбаршчыкі цьвёрда ведалі, каго яны абіраюць.

Наконт працы гарсаветаў тав. Энукідзэ зазначае, што агульнасаюзны закон аб правох і абавязках гарсаветаў, нядаўна выдадзены, павінен упарадкаваць іх дзейнасьць.

Потым тав. Энукідзэ спыняецца на пытаньні аб нормах прадстаўніцтва. Пытаньне гэтае яшчэ ня ўсе зразумелі. Але ўсе добра ведаюць, як павінен ажыцьцяўляцца ўплыў рабочае клясы на савецкае будаўніцтва. На нарадзе гутарка ішла пра аднолькавыя выбарчыя нормы пры выбарах у гарадзкія і сельскія саветы. Канстытуцыя РСФСР,—а яна павінна быць асноваю для ўсіх савецкіх канстытуцый, да таго-ж, яна была выпрацавана пры непасрэдным удзеле Ўладзімера Ільліча,—ніякае розьніцы між выбаршчыкамі пры выбарах у гарадзкія і сельскія саветы ня робіць. Няма ніякіх катэгорый—усе гэтыя выбаршчыкі выбіраюць на агульных падставах. У РСФСР гэта сурова праводзілася. Страціла ад гэтага рабочая класа свой уплыў? Нікольні. Няма патрэбы ламаць асноўную канстытуцыю і ўводзіць розныя нормы, дзе гэта не выклікаецца выключнымі варункамі. Расьсяленьне выбаршчыкаў рабочых і сялян пры выбарах у саветы напрэвільна, палітычна шкодна, і яго трэба паступова зжываць там, дзе яно да гэтага часу засталося. Іншая справа ў выбары на зьезды саветаў, у вышэйшыя органы ўлады. Тут устанаўляюцца розныя нормы для выбараў—для сялян і рабочых, для сельскіх і гарадзкіх выбаршчыкаў. Гэтая няроўнасьць патрэбна для таго, каб забясьпечыць у нашых кіруючых і законаўчых органах уплыў рабочае клясы, бо колькасна яна нязначна ў параўнаньні з сялянствам. Але я лічу, што ў будучым усё большае разгортваньне сацыялістычнага будаўніцтва, уцягненьне ў гэтае будаўніцтва ўсяго сялянства, уздым культурнага ўзроўню апошняга дадуць нам магчымасьць устанавіць адзіныя нормы для выбаршчыкаў, хоць, паўтараю, яшчэ не настаў для гэтага час.

Нарэшце, т. Энукідзэ закранае пытаньне наконт выхаду з саветаў і зазначае на патрэбу асьцярожна зьмяньваць працаўнікоў, бо бягучасьць працаўнікоў не дае нармальных умоў для працы.

Спыніўшыся на пытаньні аб нарадку галасаваньня на выбарчых сходах, тав. Энукідзэ зазначае, што патрабаваньне большасьці галасоў усіх сяброў сходу спрыяе аўтарытэту як самога сходу, так і абранага кандыдата. Адносная большасьць галасоў сьведчыць аб незацікаўленасьці сходу кандыдатам.

Пасьля тав. Энукідзэ з заключным словам выступіў тав. Кагановіч.

Тав. Энукідзэ, зачыняючы нараду, зазначыў, што яна дала вялікі матар'ял. Гэты матар'ял будзе сыстэматызаваны і шырока выкарыстаны ў надыходзячую кампанію перавыбараў.

Справаздачную кампанію пачаць зараз-жа.

Рэзалюцыя нарады.

Нарада адназгодна ўхваліла рэзалюцыю, у якой лічыць, што падрыхтоўчая праца і справаздачная кампанія да выбараў у саветы павінна распачацца зараз-жа. На падставе вывадаў дакладчыкаў і вучоту спрэчак павінны быць распрацаваны канкрэтныя дырэктыўныя зазначэньні цэнтральным і мясцовым савецкім органам. Гэтыя зазначэньні павінны забясьпечыць своячасное і адпавядаючае сучасным палітычным задачам правядзеньне надыходзячае выбарчае кампаніі.

Нарада просіць прэзыдыум ЦВК СССР пасюрыць выпрацоўку дырэктыў, выдаць стэнаграфічную справаздачу пасяджэньняў нарады і разасласць яе на месцы, як кіруючы матар'ял пры перавыбарах.

Прывітаньні ўраду БССР.

УСЕБЕЛАРУСКАМУ СТАРАСЬЦЕ ТАВ. ЧАРВЯКОВУ.

Урачыстае пасяджэньне, якое прысьвечана адчыненьню другога тыражу пазыкі ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі, пасылае сваё гарачае прывітаньне. Працоўныя масы Гомельшчыны, як ўсяго Савецкага Саюзу, ахвотна адгукнуліся на прызыў сялянскай улады падпісацца на другую пазыку індустрыялізацыі.

Мы абяцаем савецкай уладзе, што і далей буўзем прымаць актыўны ўдзел у справе сацыялістычнага будаўніцтва.

Па даручэньні сходу—ТЫРАЖНАЯ КАМІСІЯ.

Старшыні ЦВК СССР і ЦВК БССР тав. Чарвякову і Старшыні СНК БССР тав. Галадзеду.

Агульны сход рабочых-чыгуначнікаў, будаўнічых рабочых фабрык, заводаў Барысаву, сабраўшыхся на ўрачысты мітынг з прычыны адчыненьня новага чыгуначнага маста праз Бярэзіну, пасылае Вам шчырае пралетарскае прывітаньне, адзначаючы пабудову новага маста, як дасягненьне сацыялістычнага будаўніцтва, дапамагаючае ўмацаваньню эканамічнай магутнасьці і абароназдольнасьці БССР.

Барысаўскія пралетарыі завяраюць Вас у сваім імкненьні яшчэ больш умацаваць гэтую магутнасьць, і калі патэбна будзе—стаць на абарону нашае Савецкае краіны.

ПРЭЗЫДЫУМ.

У Саюзе ССР.

У глыбі стэпаў завод-волат.

Пустэча абярнулася ў культурны асяродак.

МАСКВА, 11-Х. У Карсакпаі, у Казакскім стэпу адбыўся спробны пуск першага ў СССР медна-плавільнага заводу.

Завод распачаў будавацца ў 1925 г. Месца пабудовы было выбрана за 380 кілёмэтраў ад чыгункі, нават ад качавых шляхоў. Шлях, які злучаў завод з бліжэйшай чыгуначнай станцыяй Джусалы (Ташкенцкае чыгункі), праходзіў па бязводнай саланчаковай пустэчы. На месцы ня было ніякае рабочае сілы. Інжынэрна-тэхнічны склад даводзілася набіраць з вялікаю цяжкасьцю. Перавозіць неабходнае абсталяваньне было амальшто немагчыма. Ня лёгка было дастаўляць харч рабочаму жыхарству ў стэпу. Не зважаючы на ўсе гэтыя перашкоды, праца мала-па-малу разгарнулася.

Завод пабудован і абсталёван водлуг апошняга слова амэрыканскае тэхнікі. Ён можа випушчаць 5 тысяч тон медзі ў год, г. зн. блізка 30 проц. усяе медзі, якая здабываецца з руды СССР. Ад заводу зараз пракладзена чыгунка, якая злучае яго з меднымі руднікамі ў Джэскасгане і каменнавугольнымі капальнямі ў Бай-Кануры. Разам з заводам у далёкім стэпу засноваўся магутны культурны цэнтр.

7-га лістапада ў дзень 11-х угодак Кастрычніка адбудзецца ўрачысты пуск заводу.

АЭРААРКТЫЧНЫ ЗЬЕЗД У БЭРЛІНЕ.

ДЭЛЕГАЦЫЯ АД СССР.

ЛЕНІНГРАД. 11 кастрычніка з Ленінграду выляцелі ў Бэрлін старшыня савецкае групы аэрааркты праф. Ісачанка і сябры групы—праф. Шмідт і праф. Візэ, запрошаныя прэзыдыумам аэрааркты для ўдзелу ў пасяджэньні пленуму 12 кастрычніка пад старшынствам Фрытыёфа Нансэна. Задачаю пленуму зьяўляецца распрацоўка пляну навуковых дасьледаваньняў, якія маглі-б быць праведзены ў часе надыходзячага палёту дырыжаблю.

Вынаходка сусьветнага значэньня.

ЛЕНІНГРАД. 12-Х. Прафэсар Вэйнберг распрацоўвае плян абсталяваньня вынайдзенае ім элекрычнае станцыі, якая працуе на сонечных праменьнях. Вопыты будуць праводзіцца ў Сярэдняй Азіі, дзе будзе абсталявана сонечная сілавая станцыя магутнасьцю ў 300 кілёўат.

Вынікі выбараў у Латвіі.

«Глос Правды» (№ 281) паведамляе, што пры выбарах у латвійскі сойм на агульную лічбу 100 мандатаў камуністы атрымалі 5 мандатаў, незалежныя сацыялісты—3, сацыял-дэмакраты — 27, радыкальныя групы—3, цэнтр—6, партыя дробных арандатараў—4, сялянскі саюз—17, каталікі —4, правіца—10, нацыяналісьці—21, з іх 6 немцаў, 6 расейцаў, 6 яўрэяў і 3 палякі.

Аўстрыйскі ўрад прызнаў безпадстаўнасьць інцыдэнту з т. Горкіным.

ВЕНА, 11-Х. Аўстрыйскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе: «Начальнік аддзелу друку кіраўніцтва саюзнага канцлера, паўнамоцны міністр Людвіч запрасіў сёньня на гутарку карэспандэнта «Известий» Горкіна. Людвіч заверыў Горкіна, што кіраўніцтва саюзнага канцлера ўжыве ўсе залежныя ад яго захады, каб забясьпечыць у будучым бесперашкодную журналісцкую працу прадстаўнікам «Известий».

ЛІЛЬСКІЯ СТАЧАЧНІКІ НЕ ЗДАЮЦЦА.

ПАРЫЖ, 10-Х. Тэкстыльшчыкі Туркуэну і Арманцьеру арганізоўваюцца пад кіраўніцтвам унітарных саюзаў для барацьбы за павялічэньне заработку.

15 тысяч бастуючых у Алюэне і ваколіцах Ліллю трымаюцца стойка.

Катастрофа ў Празе.

ПРАГА, 9-Х. Сёньня ўдзень у цэнтры гораду каля вакзалу Дэні абваліўся амаль-што скончаны будавацца будынак у 5 паверхаў. Думаюць, што лік загінуўшых пад руінамі рабочых складае 60 чалавек.

Абвал тлумачаць дрэннаю якасьцю цэмэнту.

МЕНШАВІКІ „ПРОЦІ" ПАНЦЫРНІКА

КАБ АДЦЯГНУЦЬ РАБОЧЫХ АД УСЕНАРОДНАГА ГАЛАСАВАНЬНЯ.

БЭРЛІН. Выступаўшы на канфэрэнцыі сацыял-дэмакратычных арганізацый правінцыі Брандэнбург і прыгранічные вобласьці старшыня партыі Вэльс заявіў, што сацыял-дэмакратычная фракцыя рэйхстагу падала прапанову спыніць пабудову панцырнага крэйсэра.

Праз ужываньне такіх мапэўраў сацыял-дэмакраты імкнуцца дасягнуць давер'я сярод сацыял-дэмакратычных рабочых і адцягнуць іх ад удзелу ў падачы галасоў за ўсенароднае галасаваньне проці пабудовы панцырнага крэйсэра.

„ФОРВЭРТС" НА ЎТРЫМАНЬНІ БАНКІРАЎ.

БЭРЛІН, 11-Х. Газэта старое сацыял-дэмакратыі (адколатае правае крыло сацыял-дэмакратычнае партыі ў Саксоніі) «Фольксштат», якая выходзіць у Дрэздэне, паведамляе, што „Форвэртс" атрымаў нядаўна ад банкіра Гольдсьміта, дырэктара Дармштадзкага банку, субсыдыю ў 800 тысяч марак.

Дырыжабль „Граф Цэпелін" паляцеў у Амэрыку.

БЭРЛІН. Дырыжабль «Граф Цэпелін» выляцеў 11-га кастрычніка з Фрыдрыхсгафэна ў напрамку на Штаэль і паляціць у Злучаныя Ты Ба-

2-ей УСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД КАЛГАСАЎ.

СТАНОВІШЧА КАЛЕКТЫЎНЫХ ГАСПАДАРАК.

Даклад тав. Аксючыца.

Сетка калгасаў расьце.

Калектыўныя гаспадаркі ў Беларусі пачалі арганізоўвацца ў 1919 годзе і колькасьць іх штогод узрастала. Да 1-га ўсебеларускага зьезду калгасаў, які адбыўся год таму назад, па БССР налічвалася 416 калгасаў. Калгасаў тры віды: с.-гасп. камуны, с.-гасп. арцелі і таварыствы па супольнай апрацоўцы зямлі.

Асаблівасьць калгаснага будаўніцтва, іх разьвіцьцё і гаспадарчае ўзмацненьне ўжо ў першы пэрыяд вымагалі больш складаных спосабаў кіраўніцтва калгасамі, выдзяленьня для гэтай мэты самастойнага цэнтру, які забясьпечваў-бы ўсе патрэбы калгаснага руху. Але ўмовы фінансавага парадку не дазволілі ў мінулым годзе поўнасьцю ажыцьцёвіць гэта мерапрыёмства.

Да пачатку мінулага гаспадарчага году сетка калгасаў складалася з 48 камун, 292 сельска-гаспадарчых арцеляў і 76 таварыстваў па супольнай апрацоўцы зямлі. Трэба дадаць, што з агульнага ліку калгасаў было 124 яўрэйскіх. Агульная зямельная плошча ўсіх калгасаў складала 55.100 гектараў, а сярэдняя плошча аднаго калгасу—132 гэкт.

Да 1-га кастрычніка 1927 году земляўпарадкаваньне было праведзена ў 80 проц. калгасаў, а гаспадарчае ўпарадкаваньне з увядзеньнем шматпольля—у 77 проц. агульнага ліку гаспадарак.

Па ўсіх калгасах насельніцтва было 21330 чалавек, і асноўныя капіталы калгасаў складалі 6.635.000 руб.

Што рабілася для ўзмацненьня калгасаў.

Побач з некаторымі дасягненьнямі было шмат недахопаў як з боку арганізацыйна-гаспадарчага, так і з боку ўнутранага распарадку. Пасьля 1-га зьезду калгасаў далейшая праца на іх абслугоўваньню была скірована па двух напрамках: узмацненьне і спэцыялізацыя існуючай сеткі і выяўленьне магчымасьці і напрамку далейшага разьвіцьця калектыўнага будаўніцтва.

Для ўзмацненьня старых калгасаў былі прыняты меры, каб арандаваная імі зямля была перададзена ў іх працоўнае карыстаньне. Такі-ж самы напрамак быў узяты і ў галіне будынкаў, інвэнтару і тэхнічных прадпрыемстваў.

Увесь час вялася і вядзецца праца па ўзмацненьні плянавасьці ў рабоце калгасаў. У часе перавыбарчай кампаніі ўдалося некалькі палепшыць склад кіруючых органаў калектываў. Для падвышэньня кваліфікацыі членаў калгасаў было праведзена шэраг курсаў: для кіраўнікоў калгасаў (скончыла 27 чалавек), для падрыхтоўкі трактарыстаў (20 чал.), для масларобаў і сыраварaў (20 чал.) і па птушніцтву (20 чал.); але, зразумела, гатага далёка яшчэ недастаткова. Трэба, каб ад кожнага калгасу было прапушчана праз курсы ня менш як па 1-му чалавеку. Асабліва курсы патрэбны для кіраўнікоў калектыўных гаспадарак.

Палепшылася сувязь калгасаў з сыстэмай с.-г. кааперацыі; забясьпечаньне калгасаў с.-гасп. машынамі і амаль што поўнасьцю праходзіць праз сыстэму кааперацыі. Горш справа ў галіне збытавой працы: у нашых калектываў яшчэ ёсьць жаданьне ў збыце прадуктаў сваёй вытворчасьці адарвацца ад кааперацыі і гандляваць з прыватнікамі. Трэба, як сыстэме кааперацыі, так і самім калгасам прыняць усе меры да таго, каб снабжэнчаска—збытавая праца праходзіла праз сельска-гаспадарчую кааперацыю. Для гэтага трэба перайсьці на сыстэму генэральных дагавораў.

Крэдытаваньне калгасаў палепшылася.

Крэдытаваньне калгасаў значна палепшылася: павялічан разьмер крэдытаў, працягнуты тэрміны крэдытаваньня, зьменшан процант па пазыках. Але гэтага яшчэ недастаткова.

Водлуг пляну, на мінулы год крэдыт для калгасаў вызначаўся ў суме 1.426.500 руб. Але атрымана ўжо калгасамі 1.949.800 р.,—больш чым было вызначана плянам. Трэба адзначыць, што калгасы скарыстоўвалі крэдыты не ў адпаведнасьці з плянавымі меркаваньнямі. Так, на рабочую жывёлу вызначалася 330000 р., а выдадзена 586400 руб., на прадукцыйную жывёлу замест 140.000 р. выдадзена 480100 руб., на індустрыялізацыю замест 235.000 руб.—114.000 р. і г. д.

Рэканструкцыя сельскай гаспадаркі калгасамі праводзіцца далёка нездавальняюча. Справа ў тым, што апарат на арганізацыйна-інструктарскаму і вытворча-тэхнічнаму абслугоўваньню калгасаў аказаўся колькасна недастатковым і якасна слабым. Слаба пастаўлена ў калгасах і культасьветная праца. Справаздачна-перавыбарчая кампанія калгасаў мела вялікае грамадзка-палітычнае значэньне. Амаль па ўсіх райёнах прыцягвалася ўвага савецкай грамадзкасьці і селянства. На перавыбарчых сходах праводзілася належная агітацыйная праца, якая садзейнічала калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

Вялікае значэньне меў і абгляд калгасаў. Абгляд дапамог выявіць хворыя бакі калектыўнага будаўніцтва. Некаторыя калгасы прымалі ўдзел і ва Ўсесаюзным абглядзе і нават былі прэміраваны, што падахвоціла лепшыя калгасы да яшчэ большых дасягненьняў.

Буйны рост калгасаў.

Мінулая вясеньняя кампанія праводзілася ў напрамку пастаноў, якія вынес XV партзьезд. Пастановы гэтыя пры садзейнічаньні савецкай грамадзкасьці і нашага друку прасяклі ва ўсе куткі і выклікалі буйны рост калектыўнага руху. Так, за час пасеўнай кампаніі да 1-чэрвеня арганізавана 388 новых калектываў, з іх 19 камун, 291 с-гасп. арцель і 78 таварыстваў на супольнай апрацоўцы зямлі. Усе гэтыя віды калгасаў яднаюць 3110 сем'яў з 13838 сялянамі. Сацыяльна-эканамічны склад нанова арганізаваных калгасаў—бядняцка-серадняцкі. Больш заможных сялян толькі каля 4 проц.

Побач з надзвычайным ростам новых калгасаў назіраецца і гаспадарчае ўзмацненьне старых. Так, мы мелі павялічэньне пасеўнай плошчы, прадукцыйнай жывёлы, павялічэньне вытворчасьці працы, пераход больш простых відаў аб'яднаньняў у больш складаныя. Назіралася таксама павялічэньне асноўных сродкаў вытворчасьці, недзялімых капіталаў, увядзеньне большай плянавасьці, палепшаньне адносін з сялянствам і г. д.

Мы маем буйны рост калгасаў, але трэба рашуча паставіць пытаньне і прыняць меры да арганізацыйна-гаспадарчага ўзмацненьня калектыўных аб'яднаньняў, падняцьця іх культурна-гаспадарчага ўзроўню шляхам узмацненьня абслугоўваньня з боку кіруючых органаў.

Недахопы павінны быць улічаны.

У чэрвені і ліпені былі праведзены акруговыя зьезды калгасаў па ўсіх акругах Беларусі. Зьезды прайшлі надзвычайна актыўна і далі вельмі каштоўны матар'ял.

З матар'ялаў акруговых зьездаў відаць, што яшчэ ня ўсюды зьвернута дастатковая ўвага пытаньню калектывізацыі і ня ўсюды створана належная грамадзкая думка навокал пытаньня калектывізацыі сельскай гаспадаркі. На мясцох арганізаваліся дробныя і нават можа няжыцьцёвыя калгасы.

Надзвычайна яшчэ нізкі культурны ўзровень насельніцтва калгасаў, па якіх налічваецца каля 40 проц. няпісьменных дарослых. Слаба разгортваецца культурна-асьветная праца.

З прычыны недастатковай колькасьці навознага ўгнаеньня і недастатковаму ўжываньню штучнага ўгнаеньня, мы ў калгасах маем яшчэ нізкі ўраджай.

Слаба абслугоўваюцца калгасы сыстэмай спажывецкай кааперацыі.

Старыя калгасы далёка яшчэ не зразумелі карысьці агракультурнай дапамогі акаляючаму насельніцтву.

Вывялася таксама на акруговых зьездах і тое, што з прычыны слабага тэмпу земляўпарадкаваньня назіраліся частыя выпадкі выхаду сялян з арцеляў (з-за неземляўпарадкаваньня. Ёсьць выпадкі няправільнага і не па прызначэньню скарыстоўваньня крэдытаў, што здараецца ў выніках слабага тэхнічнага кіраўніцтва і адсутнасьці прапрацаваных вытворчых праграм.

Кепска стаіць справа з забясьпечаньнем калгасаў запаснымі часткамі асабліва для складаных машын, што прымушае калгасьнікаў зьвяртацца да прыватніка за вельмі дарагую цану. Надзвычайна слаба ў калгасах ужываецца грамадзкае харчаваньне, яслі, дзіцячыя пляцоўкі, што не дае магчымасьці жанчынам прымаць удзел у работах па сельскай гаспадарцы, у выбарных органах і г. д.

Шмат чаго яшчэ было адзначана на акруговых зьездах калгасаў і ўсе гэтыя надзвычайна каштоўныя даныя павінны быць улічаны ў далейшай працы па абслугоўваньню і разьвіцьцю калгаснага будаўніцтва. Зьезд калгасаў павінен будзе падкрэсьліць, што масавае вытворчае кааперараваньне сельскай гаспадаркі ёсьць верны выхад з беднасьці і цемры для асноўнай масы сялянства—беднаты і серадняку.

ПРАДСТАЎНІКІ КАЛГАСАЎ АБ ПРАЦЫ НА МЯСЦОХ.

Даклад тав. Лаўкова аб задачах савецкай улады і палітысі партыі на вёсцы выклікаў надзвычайную актыўнасьць дэлегатаў зьезду. Прадстаўнікі месц шчыра адгукнуліся на заклік прадстаўніка камуністычнай партыі—абгаварыць на зьезьдзе ўсе недахопы і дасягненьні ў працы на мясцох.

Дэлегаты адзначалі, што дасягненьняў у нас шмат ва ўсіх галінах нашага будаўніцтва. Гэтыя дасягненьні відавочны ўсім, але побач з дасягненьнямі ёсьць яшчэ шмат недахопаў, якія трэба агульнымі сіламі зьнішчыць.

ЧАМУ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЯ НЕ ПАШЫРАЛАСЯ ДА ГЭТАГА ГОДУ—

задае пытаньне дэлегат зьезду тав. Балвашнікаў.

— Таму, што ў калектывы ў нас часта пападалі людзі, якія ня былі зацікаўлены калектыўным жыцьцём і гэта вяло некаторыя калгасы да распаду. Дзе ў калгасе былі сапраўдныя калектывісты, там калгас пашыраўся і ўзмацняўся, а побач з гэтым карыстаўся аўтарытэтам акаляючага сялянства.

— Калгасы атрымоўвалі неадпаведную маёмасьць: адны зямлю з будынкамі, а другія—пустую зямлю. Першым патрэбен крэдыт толькі на жывёлу, а другім трэба будавацца і жывёлу набываць. Трэба крэдыты адпускаць, выходзячы з матар'яльнага становішча калгасаў, а калектывы, атрымаўшыя пустую зямлю, як ні круцяцца, ў іх нічога ня выходзіць.

НА БАРАЦЬБУ ЗА ПАДНЯЦЬЦЕ ЎРАДЖАЙНАСЬЦІ.

Нас дакаралі тут, што мы сем незачышчаным насеньнем і наогул за тое, што вядзем кепска гаспадарку, а таму ў нас і ўраджай кепскі.

Але ў нашым калгасе, гаворыць прадстаўнік Полаччыны т. Нікіценка, жыта зьбіраем да 100 пуд. з дзесяціны хоць і быў недахват угнаеньня.

Трэба нам дапамагчы будаваць сваю гаспадарку па-культурнаму, нам патрэбен аграном, тады агульнымі сіламі падымем і ўраджайнасьць.

Агульны голас прадстаўнікоў месц—усё і ўсе сілы на барацьбу за падняцьце ўраджайнасьці.

ЗА АСЬВЕТУ.

Наркамасьветы амаль нічога не зрабіў для калгаснага будаўніцтва. Асьветная справа ня ўвязана з інтарэсамі калектывізацыі вёскі—пытаньні калектыўнага будаўніцтва не прадугледжаны ў праграмах школ і гэтае трэба выправіць. У нас ёсьць выпадкі, калі з нашых дзяцей бяруць плату ў школе. Ната камуна пасылала аднаго хлапца ў Магілеўскі, а другога ў Амсьціслаўскі тэхнікумы і ніводнага з іх ня прынялі,—скардзіцца тав. Міцько.

— Мы дагэтуль яшчэ мала адчуваем у сябе на мясцох рэвалюцыю. Нам вельмі цяжка без навукі мала падрыхтаваным і малапісьменным падымаць культуру гаспадаркі. Мы просім дапамагчы нам арганізаваць яслі і школу, а тады будзем працаваць не пакладаючы рук — гаворыць дэлегатка тав. Калач.

— Трэба зьвярнуць увагу на антырэлігійную працу ў некаторых яўрэйскіх калгасах, бо нельга дапусьціць, каб з-за рэлігіі калгас ня мог трымаць сьвіньню,—просіць жанчына—прадстаўніца аднаго з яўрэйскіх калгасаў.

Патрэбны курсы калгаснага будаўніцтва для членаў калектыўных гаспадарак і перадавых сялян.

НАРКАМЗЕМ КАЛГАСАМІ НЯ ЦІКАВІЦЦА.

Цікава адзначыць, што па зьезьдзе калгасаў да ўчарашняга дню ня было відаць нікога з адказных працаўнікоў Наркамзему, а ці будуць яны прымаць удзел у далейшай працы—мы таксама ня ведаем. Бо на запытаньне аднаго з вельмі адказных працаўнікоў НКЗ—«Чаму ніхто ад вас ня прысутнічае на зьезьдзе»—ён адказаў:

— Трэба будзе, мы вас паклічам, а вы прыедзеце і даложыце.

НЕДАРЭЧНАСЬЦІ Ў ЗАГАТОЎКАХ.

Сёлета было заданьне лішкі хлеба прадаваць кааперацыі, але з-за гэтага паўстала пытаньне—каму здаваць: спажывецкай ці сел.-гаспадарчай кааперацыі?

— Прадстаўнікі спажывецкай кааперацыі,—апавядае прадстаўнік калгасу «Рассвет» з Бабруйшчыны, паставілі ультыматум, калі нам не здадзіце хлеба, дык мы вам не адпусьцім мануфактуры, мукі і інш. тавараў.

Здаецца, такой дырэктывы ніхто не даваў, каб здаваць хлеб абавязкова спажывецкай кааперацыі.

Па Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

РЫХТУЕМСЯ ДА „ДНЮ УРАДЖАЮ".

Будзем сьвяткаваць урачыста.

(Лист з Гомельшчыны).

Сёлета «Дзень Ураджаю» будзе праведзен у пэрыяд з 14 па 21 кастрычніка.

У некаторых селішчах, галоўным чынам, у земляўпарадкаваных сьвяткаваньне Дню Ураджаю будзе праводзіцца засабліва ўрачыстым характарам.

Ва ўсіх райёнах акругі будуць арганізаваны сельска-гаспадарчыя выстаўкі. У Брагінскім райёне будзе арганізавана агульна-райённая выстаўка з аддзелам на ільнаводству, у Буда-Кашалёўскім—райённая выстаўка па жывёлаводству і малочнай гаспадарцы, Веткаўскім—агульна-райённая выстаўка, Гомельскім—будзе арганізаваны конкурс карняплодаў, Камарынскім—выстаўка па жывёлаводству і малочнай гаспадарцы, Лоеўскім—райённая выстаўка пры Суткаўскай школе сялянскай моладзі, Рэчыцкім райёне—выстаўка работы сялян-вопытнікаў на Засьпенскім вопытным полі, Церахоўскім—райённая выстаўка агульнага характару, Уваравіцкім—райённая выстаўка па жывёлаводству, ільнаводству і па малочнай гаспадарцы, Хойніцкім—выстаўка дасягненьняў работы сялян-вопытнікаў, Чачэрскім—агульная (райённая выстаўка.

Апроч таго, у некаторых селішчах будуць арганізаваны сельска-гаспадарчыя куткі з выстаўкаю, дзе будуць дэманстравацца вынікі вопытаў з мінэральнымі ўгнаеньнямі, узоры розных угнаеньняў і атрут на барацьбе са шкодніками. Прысуджаньня на выстаўках прэміі будуць выдавацца замест грошай пераважна машынамі і сельска-гаспадарчым інвэнтаром.

Да „Дню Ураджаю" падрыхтаваліся.

Ворша, 12-X. Учора ў Воршы адбылася акруговая нарада райённых аграномаў, на якім дэталёва быў абгаворан плян правядзеньня «Сьвята Ураджаю».

14 кастрычніка па ўсёй акрузе адбудзецца 28 сельска-гаспадарчых выставак, прычым выстаўкі будуць ня толькі ў райённых цэнтрах, але і па сельсаветах і ў больш буйных і прыкладных калгасах.

На выстаўках будуць паказаны ўсе дасягненьні сельскай гаспадаркі Аршанчыны, асабліва будзе адзначана праца культурных сялян-дасьледчыкаў.

Для кіраўніцтва ўсёй працаю па правядзеньню сельска-гаспадарчых выставак акруговыя арганізацыі, зьвязаныя непасрэдна з сялянствам, на выстаўкі камандыруюць сваіх прадстаўнікоў.

Апрача гэтага ўва ўсіх райёнах і сельсаветах, а таксама і ў вёсках—адбудуцца ўрачыстыя пасяджэньні і сходы, дзе будуць стаяць даклады аграномаў і мясцовых культурных працаўнікоў аб пэрспэктывах павялічэньня ўраджайнасьці нашых палёў.

Сяляне з вёсак зробяць экскурсіі ў суседнія калгасы і культурныя насёлкі, дзе адбудуцца таварыскія гутаркі аб дасягнутых посьпехах і далейшых задачах. Аршанчына да правядзеньня сьвята належна падрыхтавалася і, трэба спадзявацца, правядзе яго з посьпехам.

Культурны паход у „Дзень Ураджаю".

ВІЦЕБСК, 12-X. Сёлета сьвяткаванне „Дню Ураджаю" увязваецца з правядзеньнем культпаходу намсамолу.

Акруговае праўленьне «культзмы» разам з ЦКЛСМБ пасылае на вёску «Дню Ураджаю» спэцыяльныя каманды абслугоўваньні вясковага насельніцтва. Каманды складаюцца з спэцыялістаў-тароў, аграномаў, вэтэрынарных дактароў і інш. Апрача таго, праўленьнем «культзмычкі» і навукова-грамадзкім гуртком Беларускага Дзяржаўнага Вэтэрынарнага Інстытуту пабудована перасовачная вэтэрынарная выстаўка.

Выстаўкі па льнаводзтву.

Магілеў, 11-X. Сёлета акруга не мясцом ніякае дапамогі на арганізацыю сельска-гаспадарчых выставак у дзень ураджаю з прычыны недахопаў с[illegible]каў.

Але-ж Магілеўскі райвыканком [illegible]леў арганізаваць на свае сродкі [illegible]ённую выстаўку па ўсіх галінах с[illegible]скае гаспадаркі ў вёсцы Дабрасы[illegible]чах, выстаўка наладжваецца да 14 к[illegible]рычніка.

Акруговы сельсаюз арганізоўва[illegible] свае сродкі 2 спэцыяльных выст[illegible] па ільнаводству. Адна адбудзецца [illegible] кастрычніка ў вёсцы Чорным, Шк[illegible]скага райёну, другая—7 лістапа[illegible] Саматэевічах Касьцюковіцкага раёна.

На фронце загатовак.

Цікавы пачын.

МАГІЛЕЎ, 11-X. Шклоўскае крэдытнае таварыства зрабіла цікавую спробу—уцягнуць у справу загатовак свой кааперацыйны актыў.

Вылучаны па ўсіх вёсках упаўнаважаныя, якія атрымалі аванасы і зьбіраюць другарадныя віды нарыхтовак (грыбы, яйца, ягады, рагі, капыты, рызьбе і г. д.) і тут-жа на месцы за іх расплачваюцца. Кожны тыдзень даюць адчот таварыству.

Кааперацыя на фронце загатовак.

Магілеў, 12-X. Усе крэдытныя таварыствы акругі, у ліку 41, уцягнуты ў справу загатовак. Займаюцца загатоўкамі і найбольш буйныя сельска-гаспадарчыя таварыствы. У гэтых адносінах справа абстаіць добра. Мяркуецца даць награзку і новым 11 крэдытным таварыствам, якія толькі-што адчыніліся.

Ня ў прыклад мінуламу году, сёлета няма перабояў у забесьпячэньні таварыстваў авансамі.

Найлепш разгарнулі загатоўчую працу тыя крэдытныя таварыствы, якія знаходзяцца ў райённых цэнтрах, асабліва—Шклоўскае, Хоцімскае, Чырвонапольскае, найбольш слабае—Чачэвіцкае.

З вясковых таварыстваў найлепш працуюць Самацэвіцкае, Шчарбацкае, Сухараўскае, на апошніх мясцох—Беразякскае, Даўжанскае.

Плянавае заданьне па збожжу за жнівень і верасень выканана з перавышэньнем (149 тон пры пляне ў 130 тон).

Семя-лёну загатоўлена на 1 кастрычніка 74 тоны (увесь плян—258 тон).

Зусім слаба паступае ячмень, які па большасьці яшчэ не абкалочан і адзначаецца сёлета вялікай вільготнасьцю.

Некаторыя таварыствы яе, напрыклад, Кармянскае, Хонаўскае, Журавіцкае і інш. адзначаюцца нядрэннаю працай, але ня турбуюцца прадстаўляць аб ёй належныя веды па дадзеных формах, чым шкодзяць і сабе, і сельсаюзу, і, нарэшце, тэй працы, якую яны выконваюць.

СУД НЕ ПАВІНЕН МАРУДЗІЦЬ.

Магілеў. 12-X. Па Магілеўшчыне памольны збор складае на пляну каля паловіны ўсіх хлебазагатовак. Зразумела, мы зацікаўлены ў тым, каб цалкам яго атрымаць.

Нажаль, шмат хлеба прылівае да рук уласьнікаў і арандатараў млынаў. Па трох райёнах (Магілеўскім, Лупалаўскім і Кармянскім) заўважаны факты злоўжываньняў у 9 млынох.

Памольны збор альбо зусім не запісваецца ў квітацыйную кнігу, альбо запісваецца ў колькасьці меншай, чымся яго сапраўды паступіла. У адным з млыноў Магілёўскага райёну малолася забароненае жыта з 60 проц. выхадам мукі, якая млынаром прадавалася.

Трэба, каб нарэшце найхутчэй разьбіралі справы аб злоўжываньнях на млынох, а не рабілі так, як кармянскі нарсудзьдзя, які ўжо тры тыдні «марыцца» паступіўшы да яго пратакол. Спершапачатку ён нават адмовіўся прыняць да разгляду справу і прыняў яе толькі пасьля растлумачэньня.

У сувязі з раскрытымі злоўжываньнямі а іх, зразумела, ёсьць больш, чымся выкрыта, трэба сур'ёзней паставіць справу кантролю на млынох.

ЗАГАТАЎЛЯЕМ ДРОВЫ.

Гомель, 12-X. Для задаваленьня патрэб устаноў райёнаў намячаецца ў бягучым годзе загатовіць і адпусьціць 2175 куб. саж. дроў. З іх: для школ—1585 куб. саж., для больніц—384, для розных пунктаў—80, для розных устаноў—126.

Выдача дроў для райённых устаноў будзе ўскладзена на райлесгас.

ГАРОДНІНУ—РАБОЧЫМ.

Магілеў, 12-X. Магілеўскі цэнтральны рабочы кааператыў амаль удвая пашырае, супроць мінулага году, загатоўкі гародніны.

Дасягнута згода з Днепрасаюзам аб пастаўцы апошнім 80 тысяч пудоў бульбы.

Будзе пашырана сетка крам па продажу пайшчыкам гародніны.

Розыгрыш буйных выйг[illegible]шаў адбудзецца ў Рэчы[illegible]

Гомель, 12-X. *Скончыўся [illegible] зыгрыш дробных выйгрышаў [illegible] сэрыі ўзмацненьня сяляні[illegible] гаспадаркі.*

У тыражы разыграна [illegible] выйгрышаў па 50 руб. кожны[illegible]

Для розыгрышу буйных [illegible] грышаў тыражная камісі[illegible] поўным складзе выехала ў [illegible]чыцу.

ЗА ПАДПІСКУ НА ТВО[illegible] УЛ. І. ЛЕНІНА НА БЕЛАР[illegible]КАЙ МОВЕ.

БАРЫСАЎ, 11-X. На апош[illegible] агульным сходзе асьветнікаў [illegible]раду стаяла пытаньне аб [illegible]пісцы асьветнікаў Барысаўш[illegible]ны на творы Ул. І. Леніна на [illegible]ларускай мове.

Сход выказаў думку, каб [illegible]піска праводзілася па школь[illegible] калектывам.

Праўленьню саюзу неабхо[illegible] тэрмінова разаслаць па ка[illegible]тывах зьвесткі аб умовах [illegible]піскі.

Спадзяемся, што асьвет[illegible] Барысаўшчыны будуць у пер[illegible] шэрагах па падпісцы на т[illegible] Ул. І. Леніна.

Добрая праца дал[illegible] добрыя вынікі.

Пленум Пырашаўскага сельскага с[illegible] ўхваліў пастанову ахапіць падпіскаю [illegible] вёскі і растлумачыць сялянству аб [illegible] пазыцы індустрыялізацыі. Выступаньня [illegible] трагенты прыняліся шчыра за працу [illegible] ўсіх населеных пунктах правялі сход[illegible]

Сялянства зразумела гэтае пытан[illegible] падпісваецца на пазыку. У канцы ве[illegible] ня ў сельсавеце мелася падпіскі на [illegible] руб. ад сялян ад сахі; маюцца такія [illegible] як Коз. Боркі, дзе падпісаліся на п[illegible] Ўсе сяляне і нават выклікаюць сяля[illegible] шых вёсак. Савецкая гаспадарка Ан[illegible] ва падпісалася на 500 руб. У су[illegible] момант сельсавет ня сьпіць і прав[illegible] гэтую працу далей. СЕЛЬК[illegible]

Меншчына.

АДЧЫНЯЕЦЦА КУЛЬТ[illegible]НАЯ ЧАЙНАЯ.

БАБРУЙСК, 12-X. Акруговы ка[illegible] «Чырвонага Крыжу» адчыніць ў Бабр[illegible] культурную чайную.

Ужо прыступлена да рамонту і [illegible] ляваньня памяшканьня для гэтай ч[illegible]

На адчыненьне чайнай ЦК белару[illegible] т-ва „Чырвонага Крыжу" пераслаў 5[illegible]

М. ШЭФЛЕР.

БАРАЦЬБА ЗА ПАДВАЕНЬНЕ УРАДЖАЯЎ*).

Не адзін раз на старонках друку і раней узьнімалася пытаньне аб мэтадах павышэньня ўраджайнасьці, аднак, ва ўсёй сваёй вострасьці гэта пытаньне дыскусыруецца і ў газэтах і ўчасопісях толькі ў апошні пэрыяд часу. Тыя даныя, якія прыведзены ў друку аб параўнаньні ўраджаяў у СССР з ураджаямі ў іншых краінах і тыя зусім розныя ацэнкі нашых магчымасьцяў у барацьбе за павышэньне ўраджайнасьці, з якімі прыходзяць да гэтай праблемы паасобныя прафэсары і дзеячы сельскай гаспадаркі, прымушаюць думаць, што дыскусія па праблеме павышэньня ўраджайнасьці можа і павінна адыграць надзвычайна вялікую ролю ў далейшым рэканструіраваньні сельскай гаспадаркі.

Па даных прафэсара Н. І. Вавілава, агалошаных у яго артыкуле ў № 7 часопісі «Пути сельского хозяйства», відаць, што па ўраджаю пшаніцы СССР скарыстоўвае адзінку зямельнай плошчы ў 3-4 разы менш, чымся ў культурных краінах Заходняй Эўропы. Па даных (за 1925 г.) прафэс. Масолава, агалошаных у «Экономической Жизни», відаць, што ўраджай азімай пшаніцы на 1 гэктар, складаючы ў сярэднім для СССР 5-6 цэнтнэраў, складае ў Злучаных Штатах Паўночнай Амэрыкі 8,6 цэнтнэраў, у Канадзе—12,6 цэнтнэраў, у Італіі—13,9 цэнтнэраў, у Нямеччыне—20,7 цэнтнэраў, у Бэльгіі 25,0 цэнтнэраў, у Галяндыі—26,6 цэнтнэраў. Такім чынам, ураджай азімай пшаніцы ў Бэльгіі і Галяндыі ў 4-5 разоў большы за сярэдні ўраджай азімай пшаніцы ў СССР. Гэткія самыя суадносіны паміж ураджаем іншых культур у СССР у параўнаньні з ураджаямі ў розных краінах Заходняй Эўропы, Канады і Амэрыкі.

Такім чынам, калі-б праблема павышэньня ўраджайнасьці стаяла як праблема набліжэньня ўраджаяў у СССР да ўраджаяў заходня-эўрапейскіх краін, дык трэба было-б гаварыць не аб падваеньні, а аб павялічэньні ў 4 разы, або ў 5 разоў нашых ураджаяў.

Здавалася-б, што разьвязаньне Кастрычнікаваю рэвалюцыяю аграрнага пытаньня ў СССР, з аднаго боку, значныя зрухі, якія ўнесла рэвалюцыя ў культурнасьць, [у асьвету і самасьвядомасьць усёй стомільённай сялянскай масы, з другога, павінны былі самі па сабе зьявіцца дастатковымі прадпасылкамі для магчымасьці значнага зруху ў адносіне прадукцыйнасьці нашай сельскай гаспадаркі. Аднак, пяць гадоў, якія характарызуюцца агульнай увагай усіх сіл краіны да гаспадарчага будаўніцтва яшчэ ў адносіне прадукцыйнасьці сельскай гаспадаркі ў масавым маштабе не далі такога значнага эфэкту, якога можна было-б спадзявацца пры такіх абставінах, створаных для гэтага Кастрычнікавай рэвалюцыяй. Апошні год нам даў ужо 100 проц. даваеннай пасеўнай плошчы, г. зн. у колькасным адносіне сялянства зусім ужо асвоіла на толькі сваю даваенную плошчу, але і ўсю зямлю, перайшоўшую да яго ў выніку рэвалюцыі. Аднак, ураджайнасьць за гэтыя гады павялічвалася ў сярэднім амаль такім-жа тэмпам, які мы мелі ў даваенны час.

У артыкуле тав. Кліменка ў «Правде» падаюцца даныя, якія зазначаюць, што «ў даваенны час ураджайнасьць павялічвалася прыблізна на 1 проц. (даныя за 14 гадоў) у год, за апошнія 2-3 гады мы маем павялічэньне ўраджайнасьці каля 1 з пал. проц. у год».

Само сабой зразумела, гэта тлумачыцца на тым, што сучасныя ўмовы перашкаджаюць магчымасьці значна больш хуткага тэмпу павялічэньня прадукцыйнасьці сельскай гаспадаркі, а тым, што ў першапачатковы пэрыяд гаспадарчай адбудовы краіны, якая перажыла найвялікшую ў сьвеце рэвалюцыю, уся ўвага і сілы былі згрупаваны на колькасным росьце гаспадаркі.

Паколькі ў сучасны момант задача давядзеньня пасеўнай плошчы (уключаючы асваеньне сялянамі абшарніцкай, манастырскай і інш. зямлі) вырашана ў межах 100 проц., патолькі натуральна, што якраз зараз асабліва востра ставіцца на чаргу дню праблема значнага ўзмацненьня тэмпу падняцьця прадукцыйнасьці сельскай гаспадаркі і павышэньня ўраджайнасьці.

Рэарганізацыя сельскай гаспадаркі на новых сацыяльна-эканамічных і тэхнічных пачатках, якая праводзіцца ў СССР, зьяўляецца адной з найбольш складаных задач, паставіць якую магчыма было толькі пасьля пралетарскай рэвалюцыі. Праводзіць рэарганізацыю сельскай гаспадаркі ва ўмовах, якія атрымала СССР ад ранейшага ладу, магчыма толькі пры тых умовах, што асноўныя сялянскія масы самі ўяляюць сабе неабходнасьць такой рэарганізацыі. Гэтым і тлумачыцца, што пачатак гаспадарчага будаўніцтва ў СССР быў пакладзен поваю эканамічнаю палітыкай, якая забясьпечвала зацікаўленасьць сялянства ў збыце прадуктаў сельскай гаспадаркі. Тымжа тлумачыцца і тое, што асноўнае значэньне партыя пры пераходзе да рэарганізацыі сельскай гаспадаркі надае кааперацыйнаму пляну У. І. Леніна, які стварае новыя прадпасылкі для грамадзкай зацікаўленасьці сялянства, падняцьця прадукцыйнасьці сваёй гаспадаркі і пераходу на новыя абагуленыя гаспадарчыя формы.

Новая эканамічная палітыка, плюс кааперацыйны плян У. І. Леніна, плюс пастанова апошняга зьезду партыі аб пераходзе ў наступ супроць росту кулацкіх тэндэнцый у вёсцы і за ўзмацненьне тэмпу калектывізацыі і абагуленьня вытворчых працэсаў сельскай гаспадаркі,—вось якія асноўныя вехі ўжо ўстаноўленыя партыяй для рэарганізацыі сельскай гаспадаркі.

Вырашэньне задач павышэньня ўраджайнасьці і падняцьця прадукцыйнасьці сельскай гаспадаркі (абедзьве гэтыя задачы трэба разглядаць як адну агульную задачу падняцьця сельска-гаспадарчай культуры на новай сацыяльнай і тэхнічнай аснове) магчыма толькі пры ўмовах штодзённага ўзмацненьня тэмпу руху сельскай гаспадаркі па шляху, вызначанаму асноўнымі вехамі палітыкі партыі. Задача падняцьця ўраджайнасьці можа быць разгледжана толькі разам з задачай падняцьця прадукцыйнасьці сельскай гаспадаркі, бо цяжка ўявіць сабе магчымасьць падняцьця якой-небудзь адной з галін сельскай гаспадаркі без адначасовага палепшаньня і разьвіцьця ўсіх іншых галін яе. І сапраўды, павышэньне ўраджайнасьці стварае лішкі зярна, вывяз якога за межы менш выгодны, чым вывяз таго-ж зярна, перапрацаванага ў прадукты жывёлаводзтва. З другога боку, **для падняцьця ўраджайнасьці палявых культур неабходна палепшаньне жывёлаводзтва, неабходна пашырэньне (побач з трактарызацыяй) колькасьці і якасьці рабочай жывёлы і г. д. Павысіць ураджайнасьць таксама, як і падняць агульную прадукцыйнасьць сельскай гаспадаркі, магчыма толькі пры агульным падняцьці сельска-гаспадарчай культуры, а таму для падняцьця ўраджайнасьці і для пашырэньня прадукцыйнасьці сельскай гаспадаркі неабходна перш усяго ажыцьцявіць цэлы комплекс мерапрыёмстваў забясьпечваючых агульны ўздым сельска-гаспадарчай культуры.**

Сярод артыкулаў, прысьвечаных праблеме павышэньня ўраджайнасьці, ёсьць цэлы шэраг, якія якраз стараюцца падыйсьці да гэтай праблемы адначасова з розных пунктаў гледжаньня, аб'яднаючы пры гэтым цэлы шэраг розных практычных прапаноў. Аднак, маюцца і артыкулы, якія, звужваючы задачу, згрупоўваюць яе толькі на адным-двох асобных мерапрыёмствах.

Задача падняцьця ўраджаяў і павялічэньня прадукцыйнасьці сельскай гаспадаркі можа быць вырашана ня ўжываньнем якога-небудзь аднаго мэтаду, і таму мы лічым няправільным чакаць ад разгорнутай дыскусіі якіх-небудзь рацэптаў, якія-б далі магчымасьць адразу вырашыць пастаўленую задачу. Сэлекцыянэр заўсёды будзе правы, калі будзе сьцьвярджаць, што сэлекцыя і падбор чыстасортнага насеньня спрыяюць павышэньню ўраджайнасьці. Але сэлекцыянэр, сьцьвярджаючы, што сэлекцыя—гэта адзіны мэтад для гэтай мэты, зробіць вялікую памылку. Таксама вялікае значэньне для павышэньня ўраджайнасьці ў пасобных райёнах можа мець ужываньне мінэральных і натуральных угнаеньняў. Аднак, аграхэмік, які даводзіць, што ўжываньне ўгнаеньня адно само па сабе можа вырашыць задачу павышэньня ўраджаяў, упадае ў тую-ж самую памылку аднабаковасьці.

У тым комплексе мерапрыёмстваў, якія неабходна ажыцьцяўляць для вырашэньня задач павышэньня ўраджайнасьці і падняцьця прадукцыйнасьці сельскай гаспадаркі, першае, што неабходна,—гэта дакладны канкрэтны плян аб'яднаньня ўсіх мерапрыёмстваў, якія праводзяцца ўсімі арганізацыямі і ўсімі ўстановамі, зьвязанымі з сельскай гаспадаркай.

Другое

НА ГАСПАДАРЧЫМ ФРОНЦЕ.

Асеньняя сяўба закончылася

(Барэзінскі раён).

Заданьне па правядзеньню асеньняй сяўбы ў Барэзінскім раёне выканана на 100 процантаў.

Усяго на райёну ачышчана 97 тон жыта; акрамя гэтага, пратраўлена пшаніцы 7,5 тон (насеньне ачышчалася і пратраўлівалася бядняцка-серадняцкаму насельніцтву даром).

Дзеля павышэньня с.-г. тэхнікі ў райён завезена і разьмяркована, за грошы і ў крэдыт (беднаце), с.-г. інвэнтару і машын: плугоў 84 шт., веялак 29 шт., сячкарняў 49 шт., малатарняў 5 штук, пружынных баронаў—5 шт.

Дзеля павышэньня ўраджайнасьці глебы ў райён было завезена і прадана: суперфасфату—60 тон, тамасшлаку—19 тон; гэта колькасьць далёка не здаволіла запатрабаваньне насельніцтва.

Насеўшчыкі райёну здаволены насеньнем на 90 проц. больш, чым меркавалася па пляну. У райён было завезена сартавога жыта 83 цэнт. і загатоўлена на месцы 85 цэнт. Акрамя гэтага, савгасам «Барэзіна» абменена насельніцтву 90 цэнтнэраў. Незасеяных вучасткаў няма.

Дзеля ўзмацненьня бядняцка-серадняцкіх гаспадарак с.-гаспадарч. і крэдытнымі т-вамі было раздана крэдыту: на кантрактацыю—4256 р., на штучнае ўгнаеньне—1200 р., с.-г. машыны і прылады—4100 р., насеньне 1100 р. на мэліарацыю—1500 р., на агнятрывалае будаўніцтва—1500 р., на перасяленьне для пасёлкаў)—1000 р., на будынкі і жывёлу для калгасаў—1900 р., на каапэрацыяньне беднаты—100 р. і на заснаваньне групавых садоў—1100 руб.

Па райёну закантрактавана 533 гэктары азімых пасеваў (у калгасах 85 гэкт. групамі, у пасёлках і вёсках—250 гэкт., і адзінкамі—197 гэкт., па пляну—530 гэкт.).

За апошні час назіраецца імкненьне насельніцтва да асушкі балот; за час сяўбы арганізавана 3 т-вы (усяго па райёну іх маецца 7).

З заснаваньнем групавых садоў справа палепшылася. Дадаткова атрымана 600 руб. крэдыту (усяго маецца 1100 руб.), частка грошай ужо перараслана Тлібіскаму садоваму выхаваньніку і ўсе 2500 штук сажанцаў, вызначаных для райёнаў, будуць забраны і пасаджаны на плошчы 20 гэкт.

Наогул, па райёну пашырана плошча засеву азімых на 1,5 проц., ці 500 дэсяцін, гэта пашырэньне зроблена за кошт распрацоўкі зямфондаў з пад лесу і няўжытковай зямлі.

Каб дасягнуць гэтага павялічэньня, зямельнымі працаўнікамі і членамі партыі і камсамолу было праведзена шэраг гутарак і тлумачэньняў.

Дзеля павышэньня ўраджайнасьці глебы райёну было праведзена 20 гутарак на тэму: радавы пасеў, пасеў ачышчаным насеньнем, зялёнае і штучнае ўгнаеньне; па ўзмацненьню сел. гаспадаркі аказана дапамога крэдытнымі т-вамі (выдана 17756 руб.). Вялася работа па ўзмацненьню с.-г. арцеляў, дзеля чаго быў вылучан спэцыяльны агрэпрацаўнік. Агр. Калечыц

На барацьбу з азімым чарвём.

За апошні час атрымліваюцца ўсё новыя і новыя скаргі на шкоду ад азімага чарвя. Треба адзначыць, што шкода ад яго будзе працягвацца да снегу, пагэтаму неабходна прымаць крокі да знішчэньня яго, не спадзяючыся на тое, што ён згіне сам. Неабходнасьць барацьбы з ім будзе яшчэ больш відавочна, калі мы прыдзем пад увагу, што шкода ад азімага чарва прадаўжаецца не адзін толькі год, а цэлы шэраг гадоў, і калі ў гэтым годзе ў нас будуць загублены сотні дзесяцін, дык на будучы год ён пагражае загубіць тысячы дзесяцін азімых пасеваў.

Азімы чэрвь-вусень азімай соўкі (ці пачніцы) бруднa-шэрага колеру, знізу больш сьветлы. Уздоўж сьпіны праходзяць тры цёмныя пясчаныя выяўленьня палосы. Галава з дзьвюма пачтурымі цёмна-бурымі палоскамі.

Матыль-азімая соўка мае крылы ураватыя, іржава-шэрыя ці цёмна-бурыя. Пашярок крылы цягнуцца дзве палоскі цёмнага колеру. Задніе крылы заўсёды сьветлыя.

Азімая соўка зімуе ў стадыі вусеня ў зямлі, на глыбіні ня больш пахаттага слою. Увясну вусені падымаюцца ніжэй да паверхні і тут акуклёваюцца асобай ячэйцы з больш шчыльнай глебы.

Праз 2 3 тыдні з кукалкі выходзіць матыль. Лёт матылёў пачынаецца прыблизна ў пачатку ліпеня. Кожная самка кладзе ў сярэднім каля 200 яечак. Яечкі кладуцца на сьмяцьцёвыя расьліны, часьцей усяго на пазоў, фраскурнік і асот.

Праз 5-12 дзён пасьля адкладкі яечак з іх выходзяць вусені, якія жывуць на тых-жа расьлінах і выядаюць сьвілкія дзюркі ў лісьцях.

Вусень азімай соўкі пяць разоў зьмяняе скуру—лінае. Да трэцяй лінькі ён жыве на сьмяцьцёвых расьлінах, а потым прымае свой нармальны від «азімага чарва» і ўвядзе падзімнае жыцьцё. Удзень ён ляжыць пад камочкамі зямлі, а ноччу выходзіць на карміёжку.

У гэты час ён зьядае азімыя пасевы. Пашкоджаньне часьцей пачынаецца ад краёў поля.

Часам пашкоджаньні разьмяшчаюцца плямамі. Спачатку вусені, выходзячы на карміёжку, адгрызаюць асобныя лісьця зацягваючы іх у сваю норку. Потым яны перагрызаюць карнявую шыйку. Пашкоджаная частка поля прымае від голай плошы. Толькі тады звычайна зварочваюць увагу на зроблену шкоду.

Нагляданьні паказваюць, што на тых палёх, якія рэгулярна ачышчаліся ад сьмяцьцёвых расьлін, азімай соўкі амаль што зусім на было. Калі сарнякі ня былі зьнішчаны, і вусені азімай соўкі ўжо перайшлі на азімыя, у першую чаргу трэба капаць ахоўныя канаўкі, каб забараніць здаровыя вучасткі поля ад пашкоджаных. Канавы робяцца наступным чынам. Праводзіцца баразна глыбінёю ў 20-25 сантымэтраў плугам так, каб зямля адкідывалася ў бок пашкоджанага поля, а адвесны бок быў да здаровага поля. Яшчэ лепей, калі гэтую баразду потым паглыбіць да 30-40 сант. На дне канаўкі капаюцца ямкі каля 60 сант. глыбінёю з адвеснымі сьценкамі, куды пападаюць вусені і дзе іх лёгка сабраць і зьнішчыць.

Ужываюцца і атручаныя прыманкі, якія добра раскідваць на дне ахоўных канавак. Для прыманак бяруць атрубі ці сечку з буракоў. На дзесяціну трэба 15-20 пудоў сечкі, 800 гр. (2 фунты) парыскай зелені і 12 літраў (1 вядро) патакі, разбаўленай напалову вадой.

Інспэктар па барацьбе з шкоднікамі З. СЯРГЕЕВА.

БУДУЕЦЦА НОВЫ МЕНСК.

Спадчына вайны 1914-1921 г.

На Савецкай, Ленінскай, Нова-Маскоўскай вуліцах, на Пляцу Волі, у рабочым «горадзе»—Ляхаўцы—усюды працёсься гураган вайны. Усюды пакінуў свае страшныя сьляды. Груды каменьня, гурбы цэгілы і пыльныя кучы гліны лягкі на месцы былых будынкаў. Вайна прынесла вялікія руіны.

Было страшна...

Куды, здавалася, падзенуцца тысячы бяспрытульных дзяцей, круглых сірот,



Хэміна-фармацэўтычны завод

абязлоленых і аўдавелых жанчын? Куды падзенуцца сотні сем'яў, выкінутых на вуліцу жорсткім мячом вайны?

Адказу на гэтыя балючыя запытаньні ніхто ня меў, дый мець ня мог. Адказ адзін: замест кватэр—руіны, вуліца. Замест цяпла—холад.

Сям'я рабочага з Ляхаўкі, адным гукам снараду выкінутая на вуліцу, не магла больш спадзявацца на чалавечае жыцьцё. Яна не магла спадзявацца на гэта таму, што зруйнован апошні кут, спалена апошняя вопратка. Гэта сям'я ня мела надзеі на чалавечае жыцьцё яшчэ таму, што такая сям'я не адна—іх сотні. Куды падзець усіх?

І так

жылі бяспрытульнымі.

Валяліся па вуліцы—абы дзень да вечара. І валяліся на вуліцы доўга, гадамі.

Марылі аб адным: каб перасталі дзікія каршуны-імпэрыялісты падтрымліваць польскіх паноў і расейскіх генэралаў, ды каб вайна хутчэй скончылася.

Хацелі жыць, мірна працаваць, прыбіраць з вуліцы сірот і ўдоў.

Аб большым нельга было марыць, бо кожны ведаў, што немагчымага быць ня можа.

У такім стане быў пакінут Менск—чырвоная сталіца Савецкай Беларусі.

Перш за ўсё мы пачалі будаваць дамы, каб прыбраць людзей з вуліцы. Вось

як мы будавалі.

Спачатку шалашы з дошчак, а часам нават палатняныя. Ня было за што будаваць лепшага. Усяго ня было: ня было заводаў, хлеба, адзеньня, ня было і грошай.

Праходзілі гады. Настаў 5-цігадовы юбілей Кастрычнікавай рэвалюцыі. Многія ўжо былі ў хатах, мелі што есьці, добра ўбіраліся.

Раны залечваліся...

У той час пачалі ўжо думаць аб пабудове заводаў, аб пабудове большых дамоў. Часовыя шалашы, палаткі і зямлянкі зьнікалі.

Рабочы з Ляхаўкі ўвёў сваю сям'ю ў хату, але гэты рабочы тады казаў:

— Кастрычнік мы здабылі яшчэ не для гэтага.

І ўзяўся рабочы з Ляхаўкі за молат і пачаў ім моцна грукаць.

Гады ўпартай, напружанай працы. Гады нясупыннага змаганьня на гаспадарчым фронце.

І пасьля 10-цігодзя Кастрычнікавай рэвалюцыі мы можам пахваліцца і ўсім паказаць

нашае новае будаўніцтва.

Рабочых сем'яў больш ужо няма на вуліцы. Яны ўсе разьмясьціліся ў цёплых памяшканьнях; усе абсталявалі сабе прытульныя кватэры і жывуць ужо ня так, як жылі ў суровыя гады вайны.

Рабочыя ўвайшлі ў добрыя дамы, бо вырасьлі стройныя рабочыя пасёлкі.

Цяпер рабочыя ня гніюць у сутарэньнях, бо пры заводах маюць свае «гарадкі»—рабочыя пасёлкі, прыстасаваныя да іх жыцьця, да іх запатрабаваньняў.

Гарбары, апроч рабочага пасёлку, маюць свой клюб. Будаўнікі, дрэваапрацоўшчыкі, друкары, хэмікі, працаўнікі зямлі і лесу, савецкія і гандлёвыя служачыя—таксама. Харчавікі, мэталісты ня мелі, дык будуюць.

За апошнія гады ўпартай працы мы пабудавалі цэлы шэраг новых заводаў на Ляхаўцы. Шмат пераабсталявалі аналь нанова. Вырасьлі новыя гарбарні і цагельні. Пачалі расьці іншыя заводы. Канчаецца пабудова вялікага хэміка-фармацэўтычнага заводу. Гэты завод, па свайму надворнаму выгляду,

На будаўніцтве Унівэрсытэцкага Гарадка.

найлепей характарызуе нашае савецкае будаўніцтва.

Канчаецца кладка сьцен вялікай (40 кватэрнай) камяніцы пад кватэры для рабочых побач з Камуністычным Унівэрсытэтам імя Ў. І. Леніна. Такая-ж камяніца будуецца і на вуліцы К. Маркса.

Распрацован вялізарны пляц у райёне Земляробскага завулку пад будынкі Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту. На тэрыторыі цэлага былога кварталу стаяць рыштаваньні, пабудаваны часовыя будынкі для пэрсаналу будаўніцтва, праразаюць паветра вышкі бэтонамяшалак; уверх узьняліся ўжо сьцены некаторых унівэрсытэцкіх карпусоў. Тут праца кіпіць ад раньня і да вечара.

Галоўныя вуліцы Менску на час заціхлі. Рух па іх зьменшыўся. Толькі групы рабочых нешта робяць на сяредзіне вуліц. Падышоўшы бліжэй, можна пабачыць разбураны брук. Далей—шпалы, яшчэ далей—рэйкі. Там, за рэйкамі, вуліца прыняла свой стары выгляд: брук упарадкаван, розных рабочых прылад няма, гурбы каменьня ўлягліся на сваё старое месца. Дзьве рэйкавыя дарожкі пабеглі праз увагорак вуліцы. Гэта будуецца трамвай.



Будынак Камунбанку.

Менск пачынае мяняць свой твар. Ён маладзее. Хутка прыдзе час, што трудна будзе пазнаць яго. Ужо цяпер такія вяліканы, як хэміка-фармацэўтычны завод, дом селяніна, камунбанк значна перамянілі яго надворны выгляд.

Новы Менск стаў новым ня толькі ў адносінах да рабочых. Ён новы і ў адносінах да сялян. **Селяніны, які прыехаў у Менск з свае маленькае вясковае хаткі, пападае ў свой сялянскі палац, у**

Дом Селяніна.

У сваім палацы селянін знойдзе ўсё, што яму патрэбна: добры адпачынак, сьветлы і вялікі пакой, клюб, тэатр, кіно, параду агранома, адваката, рэдакцыю свае сялянскае газэты. Адным словам, усё, што яму патрэбна знайсьці ў горадзе, пачынаючы ад адпачынку і канчаючы вясёлым правядзеньнем часу.

Новы Менск яшчэ і таму, што замест дробных гандлярскіх крамак вуліцу ўпрыгожваюць вялізарныя вітрыны каапэрацыі; новы Менск таму, што само жыцьцё ў ім зрабілася новым.

Усюды калектыў. Нават сам новы Менск стаў вялікім калектывам, бо агульнымі сіламі ён аднаўляецца.

С. Азерскі.

У Эканамнарадзе пры СНК БССР.

Аб загатоўках мяса ў БССР у 1928-29 г.

Эканамічная Нарадаю зацьверджан плян загатовак мяса ў 1928-29 годзе ў разьмеры 21 тыс. тон, г. зн. з 35 проц. павялічэньнем у параўнаньні з мінулым годам. Гэтыя загатоўкі будуць праводзіцца, галоўным чынам, па лініі папырэньня ахопу таварнай часткі мясной прадукцыі дзяржаўнымі і каапэрацыйнымі арганізацыямі з выцясьненьнем прыватніка з загатоўчага рынку. Па паасобных акругах плян мясазагатовак разьмяркован наступным парадкам: Менскай—3.200 тон, Віцебскай—2.300 тон, Бабруйскай—3.800 тон., Гомельскай—2.600 т., Мазырскай—3.200 т., Аршанскай—1.800 т., Магілеўскай—2.400 т. і Полацкай—2.700 т. НК Гандлю даручана зьвярнуць асаблівую ўвагу на ўзмацненьне загатоўчых апаратаў у Мазырскай, Гомельскай і Магілеўскай акругах.

На падставе даных аб мясазагатоўках за папярэднія гады ўстаноўлены тэрміны выкананьня пляну па паасобных кварталах. Асноўнымі загатоўшчыкамі мяса зацьверджаны наступныя арганізацыі: Белмясгандаль (45 проц.), Белсельсаюз (40 пр.), і Белкаапсаюз (15 пр.). Белкаапсаюз і Белсельсаюз павінны праводзіць загатоўку мяса праз сваю нізавую сетку, а Белмясгандаль—праз свой апарат, а таксама і праз нізавую сетку сельскагаспадарчай і спажывецкай каапэрацыі па ўзгадненьні з адпаведнымі акруговымі каапэрацыйнымі цэнтрамі. Забараняецца праводзіць загатоўкі мяса гэтым загатоўшчыкам праз прыватніка, а таксама забараняецца ўтрыманьне працаўнікоў па камісійнай аплаце працы. Правядзеньне самастойных загатовак мяса ЦРК, інвалідная каапэрацыяй, працоўнымі калектывамі і інш. арганізацыямі—забараняецца. Гэтыя арганізацыі павінны заключаць дагаворы па задавальненьне мясам з асноўнымі загатоўшчыкамі.

Вызначан разьмер завозу мясных прадуктаў з-за межаў БССР у ліку 5.500 тон, з якіх сала ня менш 25 проц. Выходзячы з мясных рэсурсаў БССР у 1928-29 г. устаноўлена наступнае разьмеркаваньне яго для задавальненьня патрэб і для вывазу: 17 тыс. тон на задавальненьне асноўных рабочых цэнтраў, 8.500 т. для каўбаснай вытворчасьці і інш. і 1000 тон для вывазу ў саюзныя рэспублікі. Задавальненьне асобных рабочых цэнтраў зацьверджана арыентыравачна ў наступных разьмерах: Менск—3.900 тон, Віцебск—2.900 тон, Гомель—2.650 т., Магілеў—1.200 т., Бабруйск—1.500 тон, Барысаў—1.360 т., Полацак—680 т., Ворша—660 т., Рэчыца—500 т., Мазыр—450 тон, Слуцак—500 т., Рагачоў—400 т. і Добруш—300 тон. Белрабсэкцыя павінна не пазьней 18-га кастрычніка г. г. заключыць генэральныя дагаворы з Белмясгандлем і Белсельсаюзам на поўнае задавальненьне патрэб у 1928-29 г. на аснове гэтага пляну загатовак.

Эканамічная Нарада прызнала патрэбным захаваць у бягучай кампаніі загатоўчыя цэны на жывёлу, якія ўстаноўлены ў другім паўгодзьдзі 1927-28 году. Па паасобных пэрыядах сярэднія гадавыя цэны 1928-29 г. не павінны перавышаць сярэдня-гадавых цэн 1927-28 г. Вяручы пад увагу вялікае значэньне ўтварэньню мясных рэзэрваў для рэгуляваньня мяснога рынку, Эканамічная Нарада прызнала патрэбным правесьці адкорм 4 тыс. штук жывёлы, што павінна быць праведзена Белсельтрэстам, Белмясгандлем і Белсельсаюзам. Прызнана патрэбным утварыць рэзэрвны фонд мяса ў замарожаным відзе. Эканамічная Нарада прызнала таксама патрэбным утварыць рэзэрвны фонд сала ў разьмеры 500 тон для рабочага задавальненьня. Выдаткаваньне фонду сала і мяса, прызначанага для рабочага задавальненьня, павінна рабіцца выключна згодна плянаў Белрабсэкцыі, зацьверджаных НК Гандлю. Для ажыцьцяўленьня намечаных плянаў мясазагатовак і задавальненьня мясам гарадоў, а таксама для ўтварэньня запасаў мяса і сала патрэбна 2.093 тыс. руб. Беларускай Канторы Дзяржбанку і НК Гандлю даручана прыняць меры да забесьпячэньня фінансаваньня мясазагатовак.

Аб загатоўках бульбы ў 1928-29 г.

Эканамічнаю Нарадаю зацьверджан таксама плян загатовак бульбы на 1928-29 г. у разьмеры 160 тыс. тон (арыентыравачна) для пакрыцьця ўнутраных патрэб, пры гэтым на патрэбы прамысловасьці—139 тыс. тон, на задавальненьне спажыўца гарадоў: Менску, Гомеля, Віцебску, Полацку, Барысава і Магілева—16 тыс. тон і на вываз—5 тыс. тон. Асноўнымі загатоўшчыкамі вызначаны: Белдзяржсьпірт, Белхарчтрэст, Белсельтрэст, Белсельсаюз і Белкаапсаюз. НК Гандлю даручана канчаткова разьмеркаваць паміж гэтымі загатоўшчыкамі вызначаны разьмер загатовак бульбы. Устаноўлены таксама тэрміны выкананьня загатоўчага пляну.

Для забясьпечаньня нармальных умоў правядзеньня загатовак бульбы, Эканамічная Нарада прызнала патрэбным даць крахмальным і броварным заводам права праводзіць самастойна загатоўку бульбянога сырцу непасрэдна на заводах, пры гэтым у радыусе 20-30 клм. знаходжаньня таго ці іншага заводу забараняецца праводзіць загатоўку бульбы ўсім дзяржаўным і каапэрацыйным арганізацыям. Забараняецца прыцягваць да загатоўкі бульбы прыватных пасрэднікаў. Каб своечасова выканаць дагаворы па кантрактацыі бульбы, Белсельсаюзу, а таксама арганізацыям апрацоўваючай прамысловасьці даручана прыняць меры да своечасовага выкананьня гэтых дагавораў. НК Гандлю даручана ўстанавіць цану на бульбу, прытрымоўваючыся стабільных цэн на бульбу ў мінулым годзе. Устаноўлен наступны разьмер камісійнай узнагароды на загатоўцы бульбы для каапэрацыйных арганізацый: для нізавой сеткі 12 кап. за цэнтнэр, для акрсаюзаў—6 кап., за ц., для цэнтральных аб'яднаньняў—3 кап. за ц. Адказнасьць за выкананьне загатоўчага пляну бульбы ўскладаецца на Белсельсаюз, Беднаапсаюз, Белхарчтрэст, Белсельтрэст і Белдзяржсьпірт.

У МАЛЕНЬКАЙ ВЁСЦЫ ВЯЛІКІЯ СПРАВЫ

Нас дзівіць адно, як гэта ў невялікай вёсцы вядуцца вялікія справы.

Культравы займаюць першае месца. **Сёлета гэта вёска першаю ў сельсавеце перайшла на шматпольле і калектыўнае заворваньне.**

Амаль кожны сялянскі хлопчык вучыцца ў мясцовай школе.

16 верасьня 1928 г. мясцовая моладзь супольна з старымі адчыніла ў звычайнай хаце чырвоны куток, куды напесьлі кніг, газэт, часопісаў.

Ня мала дапамагае ў гэтым і мясцовая настаўніца тав. Сівалобава, якая арганізуе дзяўчат і хлапцоў праводзіць чытанкі і пастаноўкі. Дзьве дзяўчыны ўступілі ў КСМ. Сёлета намечана адчыніць лікпункт, які ў мінулым годзе выпусьціў 12 чал. дзяўчат. **Сяляне падпісаліся ўсе на пазыку.**

Такім чынам, у маленькай вёсцы вядуцца вялікія справы.

Тарас Вярзіла.

Хэмізацыя сельскай гаспадаркі і ўраджайнасьць.

Хэмізацыя сельскае гаспадаркі Саюзу вылучаецца маладым, але надзвычайна хаатоўным і шмат абяцаючым мерапрыемствам. У гэтым упэўнівае нас гісьняховае разьвіцьцё хэміі за апошнія дзесяткі гадоў. Аб гэтым жа сьведчыць прыклад Заходняй Эўропы, дзе пераважна хэмізацыя сельскае гаспадаркі дапамагла ўздыму ўраджаяў на учасную вышыню.

Для распрацоўкі спэцыяльных пытаньняў хэмізацыі ўсяе народнае, а азам з гэтым і сельскае гаспадаркі Саюзу ўтворан спэцыяльны камітэт пры Савнаркоме Саюзу. У галіне хэмізацыі сельскае гаспадаркі гэты камітэт зьвярнуў асаблівую ўвагу на распрацоўку пытаньняў, зьвязаных з забясьпечаньнем сельскае гаспадаркі мінэральнымі ўгнаеньнямі. Наколькі ў пытаньнях хэмізацыі сельскае гаспадаркі маюць на ўвазе пераважна мінэральныя ўгнаеньні, а не барацьбу з шкоднікамі і г. д., а таксама ў сувязі з мінэральнай тэорыяй харчаваньня сельска-гаспадарчых расьлін, больш пэўна ў даны момант можна сказаць не аб хэмізацыі, а «мінэралізацыі сельскае гаспадаркі».

Мінэральная тэорыя харчаваньня расьлін, распрацованая нямецкім вучоным хэмікам Юстусам Лібіхам у 40-х гадох мінулага стагодзьдзя, палажыла пачатак мінэралізацыі сельскае гаспадаркі за межамі, а разам з гэтым паслужыла магутным штуршком у справе распрацоўкі пытаньняў аб звароце зямлі спажыўных матэрый, неабходных для харчаваньня с.-г. расьлін.

У першую чаргу з нехапаючых у глебе матэрый для сельска-гаспадарчых расьлін патрэбны **азот, фосфар і калій.** З рэшты неабходных расьлінам спажыўных матэрый, як вапна, магній, сталеза, алюміній, крэмній і г. д., больш прыходзіцца клапаціцца аб вапне, бо ўсе іншыя матэрыі значна менш патрэбны расьлінам і яны забясьпечваюцца запасамі гэтых матэрый у глебе.

Хэмічны склад нашых глеб ня досыць багаты. Асобныя аналізы хэмічнага складу глебы на дасьледчых станцыях даюць каля 0,09 проц. фосфарнай кіслаты, 0,12 проц. азоту і крыху больш калія ў пераводзе на сухую глебу. Прымаючы пад увагу 17-18 сант. пласту глебы, з якога, у большасьці, расьліны і харчуюцца, у 2.250 тон на гэктар, знаходзім, што ў гэтым пласту маецца каля 2 тон фосфарнай кіслаты, 2,7 тоны азоту і крыху больш калія. Гэта, так сказаць, багацьце глебы, якое належыць да дзяржавы. За эксплёатацыяй гэтага багацьця павінен быць належны нагляд.

Гэты запас багацьця глебы ня можа быць у поўнай меры выкарыстан расьлінамі, бо ен знаходзіцца ў цяжка ўсваяемай для расьліны форме і распадаецца павольна. І хаця для нашых сярэдніх ураджаяў зернавых хлябоў—каля 7 цэнт. на гэктар—патрэбна толькі каля 20 кгр. азоту, 10 кгр. фосфару і 20 кгр. калія, але браць спажыўныя матэрыі з асноўнога багацьця глебы сельска-гаспадарчыя расьліны могуць толькі да некаторай мяжы. Далей ураджаі катастрафічна падаюць. Гэтым прырода як-бы клапоціцца аб лёсе нашых патомкаў, каб не заставіць іх жабракамі. У дадатак гэтыя-ж лічбы сьведчаць аб абмежаванасьці асноўных запасаў багацьця глебы і аб неабходнасьці аднаўленьня ўраджайнасьці глебы іншым шляхам.

Тут на службу чалавеку выступаюць угнаеньні—гной, лубін, торф і розныя мінэральныя угнаеньні. Каб атрымліваць высокія ўраджаі, мы павінны ня толькі зварачваць глебе ўсё тое, што мы з ураджаем забіраем ў глебы, але даваць ёй значна больш, каб ураджаі з кожным годам падвышаліся. Абмяжоўвацца ўнясеньням у глебу хаця-б кожны год угнаеньняў па разьліку 20 кгр. азоту, 10 кгр. фосфару і 20 кгр. калія і атрымліваць 7 цэнт. ураджай мы ня можам. **Мы павінны хутка дасягнуць падвойваньня ўраджаяў.**

Каб паглядзець, як абстаіць справа з балянсам спажыўных матэрый ў глебе БССР, прывяду наступныя лічбы:

Па даных Землярыляну, за 1926 г. атрымана валавай прадукцыі сельскай гаспадаркі БССР: зернавых культур 1475840 тон зярна, тэхнічных культур—41530 тон зярна і 33160 тон валакна, бульбы—4000480 тон, кораньплодаў—180650 тон, гародніны—478650 тон, садавіны—127300 тон, саломы, мякіны і сеяных палавых траў—2862560 тон. Гэтым ураджаем з невялікай напраўкай на больш нармальны 1925 г., узята з глебы па сярэдніх даных хэмічнага складу—азоту прыблізна 70000 тон, фосфарнай кіслаты—31000 тон і калія—78000 тон. Гэта адпавядае колькасьці прыблізна 467000 тон салетры, 206800 тон суперфасфату і 260000 тон 30 проц. калійнай солі. Гэта без ураджаю прыродных сенажацяў і ў дадатак тут ня ўлічана вымываемасьць спажыўных матэрый у больш глыбокія пласты, разлажэньне бактэрыямі арганічнай матэрыі да вольнага азоту (дэнітрыфікацыі), жыцьцяздольнасьць бактэрый і гэтак далей.

Для забясьпячэньня вышэйпрыведзенага ўраджаю было ўнесена ў глебу, па даных ЦСУ і Дзяржпляну, прыблізна 13 міл. 642 тысячы тон гною ад жывёлагадоўлі, прыблізна 2427000 тон гною ў выглядзе лубіну і заваранных астаткаў канюшыны і 11862 тоны мінэральных угнаеньняў. Калі прыняць, што на хэмічнаму складу 15 пудоў гною адпавядаюць пуду азоціста-фосфарна-калійных угнаеньняў, дык бачым, што ўнесена ў пахатную зямлю розных угнаеньняў усяго 1083000 тон—у пераводзе на мінэральныя ўгнаеньні.

З вышэйсказанага можна зрабіць вывад, што мінэральных угнаеньняў за 1926-27 г. унесена толькі 1,3 проц. ад колькасьці гною, тады як у Заходня-Эўрапейскіх краінах фосфару і калія ў мінэральных угнаеньнях уносіцца нават большая колькасьць, чым з гноем. Цікава яшчэ адзначыць, што ў 1926 годзе скарыстана ў БССР прыблізна палова мінэральных угнаеньняў—у параўнаньні з 1914 годам.

Увогуле-ж, наглядаецца некаторая роўнавага па хэмічнаму складу паміж унясенным спажыўных матэрый у глебу і ўзятым ураджаем. Можна лічыць, што, мяркуючы па 1926 г., кожнагодна ў БССР зямля угнойваецца ў колькасьці 1.000.000 тон спажыўных матэрый у пераводзе на мінэральнае ўгнаеньне і прыблізна ў гэтым-жа разьмеры агрымліваецца ўраджай. На першы погляд ёсьць нейкае «благополучие», але і гэта равнавага дасягаецца, галоўным чынам, за кошт сыстэматычнага зьнішчэньня спажыўных матэрый усіх сенажацяй, бо мы ўзялі ў 1926 г. з прыродных сенажацяў 2.518.360 тон сена, што адпавядае па хэмічнаму складу прыблізна колькасьці 466.700 тон спажыўных матэрый—у пераводзе на мінэральнае угнаеньне. Гэта колькасьць спажыўных матэрый, вядома, пашла разам з гноем на ўгнаеньне палёў.

У дадатак, ня ўсё угнаеньне выкарыстоўваецца ў першы год і, бязумоўна, значная частка ўгнаеньня не падае ў ураджай, а ідзе на жыцьцяздольнасьць бактэрый, пераходзіць у нерашчыняльныя формы і г. д. Па досьледах нямецкага вучонага праф. Мічэрліха, з асобных спажыўных матэрый выкарыстоўваецца расьлінамі па азоту 0,122 часткі, па фосфарнай кіслаце 0,6 часткі і па калію 0,33 часткі. Нашы прыблізныя падлікі ў беларускіх умовах таксама падкрасьліваюць гэта.

Такім чынам, атрымліваемы намі ураджай закранае нават асноўнае багацьце нашых глеб. Унасімага угнаеньня для ўтварэньня існуючых ураджаяў нехапае. У недахопе ўнесеных угнаеньняў крыецца ў першую чаргу фактар зьніжэньня ўраджаяў у БССР.

Выхад з гэтага становішча—у **садзейнічаньні ўсямернай мінэралізацыі сельскае гаспадаркі.** Шлях гэтага ляжыць у разьвіцьці жывёлагадоўлі, ад чаго адначасова павялічыцца і колькасьць натуральнага гною, у большым скарыстоўваньні торфу, які трэба праводзіць праз скотны двор альбо кампосты, у павялічэньні пасеву лубіну на ўгнаеньне, павялічэньні пасеву канюшыны і розных бабовых на палёх і ў значным ужываньні мінэральных угнаеньняў.

У 1931-32 г. па пэрспэктыўнаму пляну мы будзем мець, па даных Дзяржпляну, ад жывёлагадоўлі 18.606.000 тон гною, ад заворваемага на ўгнаеньне лубіну і ад культуры канюшыны—8.552.000 тон спажыўных матэрый, у пераводзе на гной і 236.149 тон мінэральных угнаеньняў. Пры пераводзе паказаных спажыўных матэрый на мінэральныя ўгнаеньні будзем мець каля 2-х мільёнаў тон, з іх мінэральных угнаеньняў 11,5 проц., ад ужываньня лубіну—24, 7 проц., ужываньня канюшыны—3,2 проц. і ад жывёлагадоўлі—60,6 проц.

Такім чынам, у канцы 5-цігодзьдзя мы будзем мець замест 1 міл. каля 2-х мільёнаў тон спажыўных матэрый—у пераводзе на мінэральнае ўгнаеньне. Гэта колькасьць спажыўных матэрый, унесеная на палявыя плошчы, можа забясьпечыць павялічэньне ўраджайнасьці на 30-35 проц.

У дадатак, з прыведзенай колькасьці спажыўных матэрый ў 1931-32 г. трэба значную частку выдзеліць на ўгнаеньне сенажацяў для павялічэньня кармовага балянсу. Утварыўшыся-ж ад гэтага недахоп спажыўных матэрый да вышэйпрыведзенай колькасьці магчыма пакрыць за кошт іншых відаў угнаеньня, акрамя гною, лубіну, канюшыны і мінэральных угнаеньняў.

Тут у першую чаргу патрэбна зьвярнуць увагу **на выкарыстаньне беларускіх фасфарытаў.** Кожны пуд фасфарытавай мукі можа даць у ўраджаю прыбаўку каля паўпуда жыта. У прыведзеных вылічэньнях за 1931-32 год ужо ёсьць фасфарытавая мука ў колькасьці 51725 тон. Патрэбная колькасьць фасфарытавай мукі можа быць здабыта ў Амсьціслаўшчыне і па суседзтву з гэтым райёнам.

У другую чаргу трэба зьвярнуць увагу **на выкарыстаньне касьцей.** Жывёла, забітая ў 1926-27 г. на бойнях, дае каля 7500 тон касьцей, або 1500 тон фосфарнай кіслаты. Пры зборы ўсіх касьцей (акрамя касьцей ад заразьліва-хворай жывёлы), гэтая лічба сьмела можа быць павялічана ў 2 разы. А гэта можа даць павялічэньне ўраджайнасьці да 15000 тон жыта.

Значнай увагі заслугоўвае **таксама попел.** У 1926-27 г. у БССР вырубана больш 6 міл. куб. мэтраў дроў, якія даюць каля 50000 тон попелу. Зьяўляючыся калійна-фасфарытным угнаеньнем, попел можа даць на ўгнаеньне каля 2000 тон фосфарнай кіслаты і 3000 тон калія ў год.

Ад касьцей і попелу разам магчыма атрымаць каля 40000 тон спажыўных матэрый—у пераводзе на мінэральнае ўгнаеньне.

Торф на подсьціл і тарфяныя кампосты зьяўляецца адзэй з галоўнейшых крыніц забясьпечаньня сельскае гаспадаркі азотам. Па прыблізных падліках толькі 650000 дзесяцін торфавых балот у БССР маюць запас азоту каля 50000000 тон, або 330 міл. тон салетры.

Тут трэба дадаць, што торф зьяўляецца таксама крыніцай забясьпечаньня глебы арганічнай матэрыяй, а лугавы нізінны торф забясьпечвае глебу часткова і фосфарам. Напрыклад, па даных аналізу, лугавы торф Горацкай станцыі мае 1 з пал. проц. азоту і 3,8 проц. фосфарнай кіслаты.

Вапна, у большасьці нашых глеб, акрамя кіслых, не знаходзіцца ў мінімуме і менш патрэбна як спажыўная матэрыя, але яна дапамагае пераводу нерашчыняльных спажыўных матэрый глебы ў лепш усваяемую для расьліны форму і значна акультурвае глебы. Яно дапамагае расьліне чэрпаць спажыўныя матэрыі з асноўнага багацьця глебы.

Пры значным ужываньні мінэральных угнаеньняў, папярэдняе вапнаваньне глебы будзе абавязкова.

Аналёгічную-ж, як і вапна, карысьць можа аказаць нам у павялічэньні ўраджаяў мэргель і крэйда, запасы якіх у БССР таксама ёсьць.

Крыніцаю калійных угнаеньняў можа служыць часткова глаўканітавы пясок, месцараджэньні якога ў БССР таксама маюцца. Адзінкавыя досьледы ў БССР з глаўканітавым пяском пад жыта на супясках далі добрыя выніві.

Акрамя таго, культура вікі, сэрадэлі і інш. бабовых, заліўныя санажаці, перанос карэньнямі расьліны спажыўных матэрый з глыбокіх пластоў глебы ў павярховы пласт, дзейнасьць бактэрый глебы, зварот спажыўных матэрый з пасёўным матар'ялам, прыток спажыўных матэрый з атмасфэрнымі ападкамі, параваньне глебы, падсяўныя і пажніўныя культуры на ўгнаеньне і г. д.,—усё гэта мае поўную магчымасьць

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ УРАДУ БССР.

ПАСТАНОВА

ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ І САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР

аб зацьверджаньні палажэньня пра Народны Камісарыят Працы БССР.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць:

1. Зацьверджаць палажэньне пра Народны Камісарыят Працы БССР, якое дадаецца да гэтага.

2. Скасаваць палажэньне пра Народны Камісарыят Працы БССР за 3-га лістапада 1924 году. (З. З. БССР 1924 г., № 25-26, арт. 226).

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. ЧАРВЯКОЎ.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. ХАЦКЕВІЧ.

1 кастрычніка 1928 году
г. Менск.

Палажэньне

ПРА НАРОДНЫ КАМІСАРЫЯТ ПРАЦЫ БССР.

1. Народны Камісарыят Працы БССР рэгулюе ўмовы працы і сацыяльнага страхаваньня, ажыцьцяўляе мерапрыёмствы па змаганьні з беспрацоўем і садзейнічае будаўніцтву рабочых жыліщ.

2. Для ажыцьцяўленьня сваіх задач Народны Камісарыят Працы:

а) праводзіць на тэрыторыі БССР усе нормы па рэгуляваньні працы і сацыяльнага страхаваньня, якія ўстанаўляюцца адпаведнымі органамі СССР і БССР;

б) распрацоўвае і падае на зацьверджаньне заканадаўчых органаў БССР праекты пастаноў па пытаньнях працы;

в) выдае па паказаных у арт. 1 пытаньнях пастановы, абежнікі, інструкцыі і загады, абавязковыя для ўсіх дзяржаўных, каапэрацыйных, грамадзкіх і прыватных устаноў, прадпрыёмстваў і асоб;

г) наглядае за ажыцьцяўленьнем працоўнага заканадаўства;

д) праводзіць мерапрыёмствы для ўзмацненьня працоўнае дысцыпліны;

е) прыняе, зьмяняе і скасоўвае пастановы, інструкцыі, абежнікі і загады мясцовых органаў Народнага Камісарыяту Працы, калі яны не адпавядаюць заканадаўству альбо пастановам і дырэктывам Народных Камісарыятаў Працы СССР і БССР;

ж) апрацэстоўвае ва ўстаноўленым парадку тыя пастановы, абежнікі, інструкцыі і загады народных камісарыятаў БССР і акруговых выканаўчых камітэтаў па паказаных у артыкуле 1 пытаньнях, з якімі ня згодзеі;

з) распрацоўвае пытаньні плянавага скарыстаньня рабочае сілы і ўзгадняе іх з плянамі народнае гаспадаркі БССР;

і) вядзе навукова-дасьледчую працу па ўсіх пытаньнях кампэтэнцыі Народнага Камісарыяту Працы;

к) арганізуе на падставе заканаў патрэбныя для ажыцьцяўленьня задач Народнага Камісарыяту Працы дапаможныя ўстановы і прадпрыемствы: навуковыя інстытуты, музэі, лябараторыі і г. д. і кіруе іх дзейнасьцю;

л) выбірае і распрацоўвае па згодзе з Цэнтральным Статыстычным Кіраўніцтвам статыстычныя матар'ялы аб наймовай працы і аб сацыяльным страхаваньні;

м) мае права вытрабоўваць справы па парушэньні Кодэксу Законаў аб працы, вырашаныя ў працоўнай сэсіі альбо ў народным судзе, прысуды на якіх увайшлі ў законную сілу, і апрацэстоўваць гэтыя прысуды ў Найвышэйшы Суд БССР.

3. Па Народны Камісарыят Працы ў галіне рэгуляваньня рынку працы і змаганьня з беспрацоўем усклядзецца:

а) правядзеньне мерапрыёмстваў па рэгуляваньні працоўнага пасрэдніцтва, па падліку патрабаваньня і прапановы працы, па экспэртызе беспрацоўных і пасылцы іх на працу;

б) падлік спэцыялістаў;

в) рэгуляваньне парадку адыходу на промыслы;

г) плянавае забясьпечаньне гаспадарчых органаў сталаю і сэзоннаю рабочаю сілай і заключэньне адпаведных дагавораў;

д) удзел у правядзеньні мерапрыёмстваў па падрыхтоўцы кваліфікаванае рабочае сілы, навучаньне і перавывучаньне беспрацоўных;

е) удзел у арганізацыі культурна-асьветнае працы сярод беспрацоўных;

ж) ажыцьцяўленьне мерапрыёмстваў па змаганьні з беспрацоўем, працоўная і іншая дапамога беспрацоўным;

з) складаньне плянаў і каштарысаў на грамадзкія работы і на дзейнасьць працоўных калектываў, кантроль за правільным выдаткаваньнем сродкаў, адпушчаных на грамадзкія работы і на працоўныя калектывы і распрацоўка пытаньняў аб парадку камплектаваньня грамадзкіх работ і працоўных калектываў рабочаю сілаю;

і) удзел у распрацоўцы плянаў перасяленьня і расьселеньня;

к) удзел у разглядзе прамыслова-фінансавага пляну ў частцы, якая датычыць пытаньня рабочае сілы;

л) нагляд за правядзеньнем пастаноў аб броні падлеткаў.

4. У галіне тарыфна-канфліктнае работы на Народны Камісарыят Працы ўскладзецца:

а) правядзеньне мерапрыёмстваў, зьвязаных з нармаваньнем і рэгуляваньнем заработнае платы;

б) устанаўленьне акладаў заработнае платы рабочым і служачым дзяржаўных устаноў і прадпрыёмстваў, на якія распаўсюджана дзяржаўнае нармаваньне заработнае платы;

в) удзел у складаньні бюджэту ў частцы заработнае платы і норм аховы працы, а таксама ў вырашэньні пытаньняў аб заработнай плаце ў прамысловасьці;

г) вырашэньне ва ўстаноўленых законам выпадках працоўных канфліктаў у міравым і ў пасрэдніцкім парадку;

д) кантроль за своечасовай і правільнай выплатай заработнае платы і за выкананьнем дырэктыў уряду ў галіне заработнае платы;

е) нагляд за законнасьцю рашэньняў расцэначна-канфліктных камісій, міравых камэр і пасрэдніцкіх судоў;

ж) нагляд за вырашэньнем працоўных спраў у працоўных сэсіях і ў касацыйных інстанцыях;

з) рэгістрацыя ва ўстаноўленых законам выпадках калектыўных дагавораў.

5. На Народны Камісарыят Працы ў галіне аховы працы ўскладзецца:

а) устанаўленьне і правядзеньне ў жыцьцё мерапрыёмстваў для аздараўленьня ўмоў працы ў вытворчасьці;

б) разгляд і ўзгадненьне в пункту погляду аховы працы праэктаў будаваньня і абсталяваньня прамысловых і іншых прадпрыёмстваў;

в) падлік і вывучэньне прафэсыйных хвароб, атручаньняў і пакалечаньняў;

г) устанаўленьне спэцыяльных норм, спосабаў перасьцярогі і кампэнсацый пры шкодных умовах працы;

д) падлік катлавое гаспадаркі, абсьледваньне стану катлоў і кантроль за правільным трыманьнем іх;

е) удзел у разглядзе прамыслова-фінансавых пляноў у частцы, якая датычыць тэхнікі бясьпекі і прамысловае санітары, а таксама ўдзел у разьмеркаваньні сродкаў, якія адпушчаюцца на мерапрыёмствы па ахове працы.

6. У галіне садзейнічаньня будаўніцтву рабочых жыліщ на Народны Камісарыят Працы ўскладзецца:

а) высьвятленьне жыльёвых патрэб рабочых і служачых і нагляд за выкананьнем пляну рабочага жыльёвага будаўніцтва;

б) нагляд за выкананьнем законаў аб льготах установам і арганізацыям, якія займаюцца будаўніцтвам рабочых жыліщ;

в) вырашэньне спрэчак паміж прадпрыёмствамі і прафэсыянальнымі саюзамі пры разьмеркаваньні сродкаў на будаўніцтва рабочых жыліщ;

г) складаньне штогадовага зборнага пляну будаўніцтва жыліщ для рабочых і служачых прамысловасьці і транспарту;

д) нагляд за правільнасьцю адлічэньняў у фонд рабочага жыльёвага будаўніцтва, за захаваньнем і скарыстаньнем гэтых фондаў, а таксама за выкананьнем устаноўленых правіл аб парадку іх утварэньня і скарыстаньня;

е) арганізацыя і нагляд за ўзорным будаўніцтвам і разьмеркаваньне сродкаў, якія адпушчаюцца на гэтую мэту.

7. На Народны Камісарыят Працы ў галіне плянава-эканамічнае працы ўскладзецца:

а) распрацоўка кантрольных лічбаў і пляноў па пытаньнях, якімі займаецца Народны Камісарыят Працы;

б) удзел у распрацоўцы Цэнтральным Статыстычным кіраўніцтвам пытаньняў рабочае сілы, якая ёсьць і якая патрабуецца ў гаспадарчым будаўніцтве.

8. На Народны Камісарыят Працы ў галіне сацыяльнага страхаваньня ўскладзецца:

а) распрацоўка пытаньняў арганізацыі і структуры страхавых органаў;

б) складаньне рэспубліканскага бюджэту сацыяльнага страхаваньня;

в) распараджэньне фондамі сацыяльнага страхаваньня;

г) арганізацыя ўстаноў рэспубліканскага значэньня для абслугоўваньня застрахаваных (дамы адпачынку, санаторыі, дамы інвалідаў);

д) удзел у арганізацыі мэдычнае дапамогі застрахаваным і ва ўстаноўленым парадку скарыстаньня фондаў мэдычнае дапамогі;

е) вырашэньне пытаньняў аб назначэньні пэнсіі асобам, якія прапусьцілі ўстаноўлены тэрмін падачы заяў на пэнсію.

9. На чале Народнага Камісарыяту Працы БССР стаіць Народны Камісарыят і яго намесьнік.

10. У склад Народнага Камісарыяту Працы БССР уваходзяць:

а) інспэктары па рэгуляваньні рынку працы і змаганьні з беспрацоўем, па тарыфна-канфліктнай работе, ахове працы і па плянава-эканамічных пытаньнях;

б) Аддзел Працоўных Калектываў з правамі юрыдычнае асобы;

в) Галоўнае Кіраўніцтва Сацыяльнага страхаваньня з правамі юрыдычнае асобы;

г) Рэспубліканскі Савет Сацыяльнага Страхаваньня;

д) Плянавая камісія;

е) Сэкратарыят.

Пры Народным Камісарыяце Працы знаходзяцца: Упаўнаважаны Інспэкцыі Працы на транспарце і Упаўнаважаны Цэнтральнага Пасрэднідкага Бюро Працаўнікоў Мастацтва і могуць быць навукова-дасьледчыя і навукова-практычныя ўстановы.

11. Разьмеркаваньце функцый паміж пасобнымі часткамі Народнага Камісарыяту Працы ўстанаўляецца Народным Камісарам Працы.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

1 кастрычніка 1928 г.
г. Менск.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

ЦЕНТРАЛЬНОГО ИСПОЛНИТЕЛЬНОГО КОМИТЕТА И СОВЕТА НАРОДНЫХ КОМИССАРОВ БССР

об утверждении положения о Народном Комиссариате Труда БССР.

Центральный Исполнительный Комитет и Совет Народных Комиссаров БССР постановляют:

1. Утвердить положение о Народном Комиссариате Труда БССР, прилагаемое при этом.

2. Отменить положение о Народном Комиссариате Труда БССР от 3-го ноября 1924 года (С. У. БССР 1924 года № 25—26, ст. 226).

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. ЧЕРВЯКОВ.

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР Н. ГОЛОДЕД.

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А. ХАЦКЕВИЧ

1 октября 1928 г. г. Минск.

Положение

О НАРОДНОМ КОМИССАРИАТЕ ТРУДА БССР.

1 Народный Комиссариат Труда БССР регулирует условия труда и социального страхования, проводит в жизнь мероприятия по борьбе с безработицей и содействует строительству рабочих жилищ.

2. Для осуществления своих задач Народный Комиссариат Труда:

а) проводит на территории БССР все нормы по регулированию труда и социального страхования, устанавливаемые соответствующими органами СССР и БССР;

б) разрабатывает и представляет на утверждение законодательных органов БССР проекты постановлений по вопросам труда;

в) издает по указанным в ст. 1 вопросам постановления, циркуляры, инструкции и распоряжения, обязательные для всех государственных, кооперативных, общественных и частных учреждений, предприятий и лиц;

г) наблюдает за осуществлением трудового законодательства;

д) проводит мероприятия для укрепления трудовой дисциплины;

е) приостанавливает, изменяет и отменяет постановления, инструкции, циркуляры и распоряжения местных органов Народного Комиссариата Труда, если они не соответствуют законодательству или постановлениям и директивам Народных Комиссариатов Труда СССР и БССР;

ж) опротестовывает в установленном порядке те постановления, циркуляры, инструкции и распоряжения народных комиссариатов БССР и окружных исполнительных комитетов по указанным в ст. 1 вопросам, с которыми он не согласен;

з) разрабатывает вопросы планового использования рабочей силы и согласовывает их с планами народного хозяйства БССР;

и) проводит научно-исследовательскую работу по всем вопросам, входящим в компетенцию Народного Комиссариата Труда;

к) организует на основании законов необходимые для осуществления задач Народного Комиссариата Труда вспомогательные учреждения и предприятия; научные институты, музеи, лаборатории и т. д. и руководит их деятельностью;

л) собирает и разрабатывает по соглашению с Центральным Статистическим Управлением статистические материалы о наемном труде и о социальном страховании;

м) имеет право истребывать дела по нарушению Кодекса Законов о Труде, разрешенные в Трудовой Сессии или в народном суде, решения по которым вошли в законную силу, и опротестовывать эти решения в Верховный Суд БССР.

3. На Народный Комиссариат Труда в области регулирования рынка труда и борьбы с безработицей возлагается:

а) проведение мероприятий по регулированию трудового посредничества, по учету спроса и предложения труда, по экспертизе безработных и посылка их на работу,

б) учет специалистов;

в) регулирование порядка отхода на промыслы;

г) плановое обеспечение хозяйственных органов постоянною и сезонною рабочею силою и заключение соответствующих договоров;

д) участие в проведении мероприятий по подготовке квалифицированной рабочей силы, в обучении и переобучении безработных;

е) участие в организации культурно-просветительной работы среди безработных;

ж) осуществление мероприятий по борьбе с безработицей, трудовая и иная помощь безработным;

з) составление планов и смет на общественные работы и на деятельность трудовых коллективов, контроль за правильным расходованием средств, отпущенных на общественные работы и на трудовые коллективы, и разработка вопроса о порядке укомплектования общественных работ и трудовых коллективов рабочей силой;

и) участие в разработке планов переселения и расселения;

к) участие в рассмотрении промышленно-финансового плана в части, имеющей отношение к вопросу о рабочей силе;

л) наблюдение за проведением постановлений о бронировании подростков.

4. В области тарифно-конфликтной работы на Народный Комиссариат Труда возлагается:

а) проведение мероприятий, связанных с нормированием и регулированием заработной платы;

б) установление окладов заработной платы рабочим и служащим государственных учреждений и предприятий, на которые распространяется государственное нормирование заработной платы;

в) участие в составлении бюджета в части заработной платы и норм охраны труда, а также в разрешении вопросов о заработной плаце в промышленности;

г) разрешение в установленных законом случаях трудовых конфликтов в примирительном и третейском порядке;

д) контроль за своевременной и правильной выплатой заработной платы и за исполнением директив Правительства в области заработной платы;

е) наблюдение за законностью решений расценочно-конфликтных комиссий, примирительных камер и третейских судов;

ж) наблюдение за разрешением трудовых дел в трудовых сессиях и в коссационных инстанциях;

з) регистрация в установленных законом случаях коллективных договоров.

5. На Народный Комиссариат Труда в области охраны труда возлагается:

а) установление и проведение в жизнь мероприятий для оздоровления условий труда в производстве;

б) рассмотрение и согласование с точки зрения охраны труда проектов строительства и оборудования промышленных и иных предприятий;

в) учет и изучение профессиональных заболеваний, отравлений и увечий;

г) установление специальных норм, способов предосторожности и компенсации при вредных условиях труда;

д) учет котлового хозяйства, обследование состояния котлов и контроль за правильным содержанием их;

е) участие в рассмотрении промышленно-финансовых планов в части, имеющей отношение к технике безопасности и промышленной санитарии, а также участие в распределении средств, отпускаемых на мероприятия по охране труда.

6. В области содействия строительству рабочих жилищ на Народный Комиссариат Труда возлагается:

а) выяснение жилищных нужд рабочих и служащих и наблюдение за исполнением планов рабочего жилищного строительства;

б) наблюдение за исполнением законов о льготах учреждениям и организациям, которые занимаются строительством рабочих жилищ;

в) разрешение споров между предприятиями и профессиональными союзами при распределении средств на строительство рабочих жилищ;

г) составление ежегодного сборного плана строительства жилищ для рабочих и служащих промышленности и транспорта;

д) наблюдение за правильностью отчислений в фонд рабочего жилищного строительства, за хранением и использованием этих фондов, а также за исполнением установленных правил о порядке их образования и использования;

е) организация и наблюдение за показательным строительством и распределение средств, отпускаемых на эту цель.

7. На Народный Комиссариат Труда в области планово-экономического труда возлагается:

а) разработка контрольных цифр и планов по вопросам, которыми занимается Народный Комиссариат Труда.

б) участие в разработке Центральным Статистическим Управлением вопросов рабочей силы, имеющейся в наличии и потребной в хозяйственном строительстве.

8. На Народный Комиссариат Труда в области социального страхования возлагается:

а) разработка вопросов организации и структуры страховых органов;

б) составление республиканского бюджета социального страхования;

в) распоряжение фондами социального страхования;

г) организация учреждений республиканского значения для обслуживания застрахованных (дома отдыха, санатории, дома инвалидов);

д) участие в организации медицинской помощи застрахованным и в установленном порядке использование фондов медицинской помощи;

е) разрешение вопросов о назначении пенсии лицам, пропустившим установленный срок, подачи заявлений на пенсию.

9. Во главе Народного Комиссариата Труда БССР стоит Народный Комиссар и его заместитель.

10. В состав Народного Комиссариата Труда БССР входят:

а) инспектора по регулированию рынка труда и борьбе с безработицей, по тарифно-конфликтной работе, охране труда и по планово-экономическим вопросам;

б) Отдел Трудовых Коллективов с правами юридического лица;

в) Главное Управление Социального Страхования с правами юридического лица;

г) Республиканский Совет Социального Страхования;

д) Плановая комиссия;

е) Секретариат.

При Народном Комиссариате Труда находятся: Уполномоченный Инспекции Труда на транспорте и Уполномоченный Центрального Посреднического Бюро работников искусств и могут быть научно-исследовательские и научно-практические учреждения.

11. Распределение функций между отдельными частями Народного Комиссариата Труда устанавливается Народным Комиссариатом Труда.

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Червяков.

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР Н. Голодед.

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Хацкевич.

1 октября 1928 г., г. Минск.

ХРОНІКА.

Першы выпуск з Белдзяржвэтінстытуту.

У нядзелю, 14 кастрычніка, а 12 гадз. дню, у Беларускім Дзяржаўным Тэатры, у гор. Віцебску адбудзецца ўрачыстае пасяджэньне, прысьвечанае першаму выпуску вэтэрынарных дактароў з Беларускага вэт'інстытуту. Інстытуту выпушчаецца 80 вэтэрынарных дактароў. Наркамземам зроблена заяўка інстытуту на 120 вэтдактароў.

Пры Наркамземе арганізавана міжведамсьцьвенная камісія па разьмеркаваньню выпушчаемых вэтдактароў, з якіх 60 стыпэндыятаў.

Прыезд т. Галадзеда.

Сёньня, 13-га верасьня, прыяжджае з Масквы старшыня СНК БССР тав. Галадзед, які рабіў даклад аб дзейнасьці ўраду БССР у СНК СССР.

Рост ячэек „Чырвонага Крыжу".

За апошні час па Менскай акрузе прымячаецца рост ячэек Беларускага т-ва «Чырвонага Крыжу».

Калі на 1-га студзеня 1928 г. на Менскай акрузе налічвалася 95 ячэек «Чырвонага Крыжу» з лікам сяброў каля 5000 чал., дык зараз на акрузе налічваецца 160 ячэек з 7000 сяброў.

У далейшым прымаюцца шэраг мерапрыёмстваў па ўцягненьню сялянства ў шэрагі „Чырвонага Крыжу".

Радыёфікацыя чыгуначных станцый.

«Дорпрофсож» чыгункі МВБ пастанавіў правесьці радыёфікацыю некалькіх чыгуначных станцый, у тым ліку чыгуначных станцый Менску і Віцебску.

На гэтых станцыях будуць устаноўлены трансляцыі, якія будуць абслугоўваць чырвоныя куткі варштатаў і чыгуначных дэпо.

На 665.000 руб. прададзена смалапрадуктаў.

Беларускі саматужна-прамысловы саюз заключыў дагавор з „Всеколесом" на дастаўку апошняму розных смалапрадуктаў на суму 665.000 р.

Усяго заключан дагавор на 3. 600 тон смалапрадуктаў, з іх: на 2.400 тон смалы, 1000 тон белага і 200 тон чырвонага шпігінару.

Мэханізацыя запалкавых фабрык БССР.

Замежнае абсталяваньне для запалкавых фабрык „Чырвоная Бярэзіна" і „Дняпр" паступае. 40 проц. патрэбных замежных машын ужо атрымана, а астатняя частка машын будзе таксама своечасова атрымана.

Пры устаноўцы гэтых замежных машын усе працэсы вытворчасьці на фабрыках значна мэханізуюцца, што палепшыць якасьць прадукцыі, а таксама дасьць магчымасьць экспартаваць запалкі за межы.

Аўтабусы для БССР.

Управа Дзяржгандлю БССР атрымала на днях з Аўстрыі 10 аўтабусаў фірмы «Штэйэр».

Гэтыя аўтабусы будуць разьмеркаваны па акругах.

Апрача гэтага чакаецца атрымаць у сьнежні м-цы 6 аўтабусаў для Менску.

Новая партыя вэлёсыпэдаў.

Управа Дзяржгандлю БССР атрымала з Латвіі новую партыю вэлёсыпэдаў у ліку 100 шт.

Пытаньне аб парадку размеркаваньня гэтых вэлёсыпэдаў Управай Дзяржгандлю БССР у сучасны момант вырашаецца.

Сад культуры і адпачынку.

Гэтымі днямі на прэзыдыуме ЦСПСБ ўздымалася пытаньне аб пашырэньні саду «Прафінтэрн», які пры сваім сучасным становішчы ня можа задаволіць запатрабаваньні рабочых у адпачынку. Марнуюцца гэты сад пашырыць і зрабіць яго садам культуры і адпачынку.

На пасяджэньні былі высунуты дзьве думкі: першая думка,—што трэба да саду „Прафінтэрн" далучыць гарадзкі сад і зрабіць яго зачыненым. Па другой—гарадзкі сад павінен быць вольным, бо ў Менску ўсяго адзін сад.

Прэзыдыум ЦСПСБ пастанавіў увядзіць хадайніцтва аб тым, каб абярнуць менскі гарадзкі сад у сад саюзаў і аб асігнаваньні на гэту мэту адпаведных сродкаў.

Менскі дзень.

Менскі акруговы аддзел аховы здароўя вызначыў спэцыяльных дактароў для санітарнага агляду малочнай гаспадаркі пасялічных савгасаў.

У хуткім часе распачнецца ў Менску санітарны агляд мясных крам як кооперацыйных, так і прыватных.

Пры ўсіх рабочых амбулятотных г. Менску будуць арганізаваны інстытуты вашных дактароў, якія будуць дапамагаць амбуляторным дактарам і будуць даваць дапамогу застрахаваным на кварэрах.

Белдзяржгандаль арганізуе на вул. Розы Люксэмбург буйную рыбаёвую базу, якая будзе добра абсталявана і будзе мець дэзынфэкцыйныя камэры.

Распачынецца прачыстка трубы, у якую заключана р. Няміга ад Замкавай вул. да р. Сьвіслачы. Дзякуючы вабруджаньню гэтае трубы на Замкавай вул. у часе дажджоў бываюць паводкі.

Усебеларуская канфэрэнцыя саюзу харчавікоў распачнецца ўчора ў клюбе харчавікоў. Канфэрэнцыя заслухае даклады аб становішчы і перспэктывах харчовай прамысловасьці, аб культурна-масавай работе на зімовы сэзон і інш.

Дзеля ліквідацыі бясконнасьці ў сялянскіх гаспадарках БССР у 1928-29 г. маюць быць асигнаваны крэдыты на набыцьцё 7000 коняй.

Апавяшчэньні.

У нядзелю 14 кастрычніка, а 4-ай гадзіне ўдзень адбудзецца агульны сход сяброў 1-га групкому саюзу працаўсьветы.

АБВЕСТКА ДНЮ:

1) Справаздача групкому аб працы за год і садакład рэвізійнай камісіі;
2) перавыбары груп. М. К. і рэвізійнай камісіі;
3) выбары делегатаў на акруговую канфэрэнцыю;
4) бягучыя справы.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

Сёньня, 13-X, кіно „Обыкновенная мотэрыя [драма ў 7 част.], пачатак а 7 з пал. і 9 з палов. гадз. увечары.

Білеты для сябр. саюзу—20 к. для сябр. клюбу—15 к.

— У нядзелю, 14-X, а 6-ай гадз. увечары пасяджэньне прэзыдыюм Дому.

— У панядзелак, 15 кастрычніка, роўна в 12 гадзіне дню ў памяшканьні ЦК Саюзу Працаўсьветы будзе праводзіцца рэгістрацыя беспрацоўных—найнічыкаў ЦРК, якія да гэтага часу нішчо не зарэгістраваліся.

КУТОК ВУЧОНЫХ.

— У нядзелю, 14 кастрычніка, а 7 гадз. увечары —арганізацыйны сход гуртка аб вывучэньні фотамастацтва.

Часова вык. абав. адказнага рэдактара
П. ШАСТАКОЎ.

Справачны аддзел.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК НА 13-X-1928 г.

Абл. 1 дзярж. паз. — прад. 4—78, куп. 4—76.

Абл. 2 дзярж. паз.—прад. 5—14,5, куп., 5—12,5.

Абл. 3 сял. паз.—прад. 5—0,3, куп. 5—0,1.

Абл. 10 пр. паз. 27 году — прад. 25,58, куп. 25—43.

Абл. дзярж. паз. 26 г. — прад. 122, куп. 120.

Абл. 12 пр. дзярж. паз. прад. 104—45, куп. 104—40.

Абл. 6 проц. паз. індустр. прад. 24—93,5, куп. 24—83,5.

ЗАКЛЮЧНЫ БАЛЯНС

Шклоўскага гарадзкога камбінату

на 1-е кастрычніка 1927 году.

АКТЫЎ. *ПАСЫЎ.*

НАЗВА АРТЫКУЛАЎ	СУМА: Прыватная	СУМА: Агульная	%%	НАЗВА АРТЫКУЛАЎ	СУМА: Прыватная	СУМА: Агульная	%%
I. МАЁМАСЬЦЬ.				I. КАПІТАЛЫ:			
1. Будынкі і пабудовы вытворчыя	60882—35			а) асноўны	123063—06		
2. Будынкі навыкворчыя	5325—84			б) абаротны	11254—60		
3. Абсталяваньне і машыны	81442—14			в) амартызацыйны	4311—05	138628—71	55,61
4. Гаспадарчы інвэнтар	489—84			II. ПАЗЫКІ І КРЭДЫТЫ:			
5. Транспарт	569—47	148709—64	59,72	Доўгатэрміновыя пазыкі	11000 —		
II МАТАР'ЯЛЫ.				Банкі па вэксэлях	19500 —	30500 —	12,24
1. Групоўныя (сыравіна)	10497—01			III. Вэксалі выдадзеныя	— —	35785 —	14,35
2. Дапаможныя	1942—98			IV. КРЭДЫТОРЫ:			
3. Тэхнічныя	1290—21			1) Дастаўшчыкі:			
4. Апал	522—22	14252—42	5,72	Дзярж. органы	4271—52		
III. ПОЎФАБРЫКАТЫ	—	4920—17	1,97	Прыват. асобы	2588—41		
IV. Гатовыя вырабы	—	22981—01	9,23	2) Розныя крэдыторы	8528—59		
V. ГРАШОВЫЯ СРОДКІ				3) Пакупнікі:			
Каса	1808—36			а) Дзярж. органы	19566—02		
Бягучыя рахункі	2513—21	4321—57	1,73	б) каапэрацыя	1114—77		
VI. АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ І ДАКУМ. ДА АТРЫМ.				в) прыватн. асобы	655—24		
Вэксалі ў партфэлі	8797—50			4) Рабочым і служачым	2057—94		
„ у вучоце	19500—	28297—50	11,36	5) НКФ на падатках	436—64	39219—13	15,76
VII. ПАДСПРАВАЗДАЧНЫЯ СУМЫ	—	206—16	0,09	V. ВЫНІК:			
VIII. ДЭБІТОРЫ:				Прыбытак за 1926-27 г.		4874—77	1,97
1. Пакупнікі:							
а) Дзяржспажыўцы	9488—74						
б) Прыватныя асобы	810—94						
в) Абаненты за сьвятло	2510—63						
2. Розныя асобы і ўстановы	1373—01						
3. Дастаўшчыкі: а) дзярж. органы	2240—						
б) прыватныя асобы	8137—37						
4. Авансы рабочым і служачым	43—39	24604—08	9,88				
IX. ВЫДАТКІ БУДУЧАГА ГОДУ	—	715—06	0,30				
БАЛЯНС		249007—61	100	БАЛЯНС	—	249.007—61	100

Загадчык камбінату І. І. МАНЦЭВІЧ. Бухгальтар С. Г. СЛОНІМЧЫК.

Рахунак прыбыткаў і страт па Шклоўскаму гаркамбінату за 1926-27 год.

ДЭБЕТ. *КРЭДЫТ.*

	СУМА: Прыватная	СУМА: Агульная
1. Продукты выплачаныя	865—63	
2. Гандлёвыя выдаткі	3657—64	
3. Розныя страты	112—13	
4. Страты ад эксплёатац. млыну «Пралетары»	692—71	5328—11
Разам	5328—11	—
Прыбытак за 1926-27 справаздачны год	—	4874—77
БАЛЯНС	—	10202—88

	СУМА: Прыватная	СУМА: Агульная
1. Прыбытак ад рэалізацыі лясн. прод.	6167—90	
2. Прыбытак ад перапрац. прыв. лесасырав.	376—80	
3. Прыбытак ад эксплёатац. млыну „Барацьба"	1551—86	
4. Прыбытак ад эксплёатац. электрыч. станц.	1696—60	
5. Розныя прыбыткі	409—92	10202—88
Разам	—	10202—88

Загадчык камбінату МАНЦЭВІЧ.
Бухгальтар С. Г. Слонімчык.

Заключны баляно разгледжан і зацьверджан баляновай камісіяй пры Магілёўскім АКРФА (пратакол ад 7 верасьня 1928 г.) і да друку дазволен.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА».
Ад аўторка, 9-га кастрычніка
толькі 6 гастролай
ТРУПЫ ЛІЛІПУТАЎ «Маленькі камэдыянт»
Пад кіраўніцтвам Б. Ф. Маліноўскага
ВЯЛІКІ РОЗНАСТАЙНЫ КАНЦЭРТ.
На экране—выключны нямецкі фільм «СЫМФОНІЯ ВЯЛІКАГА ГОРАДУ».

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА".
Ад аўторка 9-га кастрычніка
падвойная праграма:
„Француская лялька" драма ў 7 частках.
Звыш праграмы Канцэртнае адзяленьне.
Пачатак 1-га сэансу роўна а 7 гадз.

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ».
Ад аўторка, 9-га кастрычніка
2-і тыдзень
„Другое жыцьцё" ў 8 частках.
Каса адчынена ад 5 гадзін.

КІНО «ПРАЛЕТАРЫ».
Кіно зачынена для рамонту.
З аўторка, 16 кастрычніка, адчыняецца СПЭЦЫЯЛЬНА
дзіцячае кіно.

Даводзіцца да ведама, што з 1-га кастрычніка распачаў сваю дзейнасьць арганізаваны Менскі акруговы сельска-гаспадарчы крэдытны саюз
„МЕНКРЭДСАЮЗ"
Месцазнаходжаньне: Менск, Рэвалюцыйная вуліца, № 3.
ПРАЎЛЕНЬНЕ.

ЗАОЧНЫЕ КУРСЫ БУХГАЛТЕРИИ, КАЛЬКУЛЯЦИИ и СТАТИСТИКИ
— Продолжительность курса—8 МЕСЯЦЕВ. —
—— Поступать на курсы можно в любой месяц года. ——
Принимаются лица с образованием не ниже 4 гр. семилетки.
ОКОНЧИВШИМ КУРСЫ ВЫДАЮТСЯ СВИДЕТЕЛЬСТВА.
Плата за первый месяц—5 руб, а за остальные по 4 руб. в месяц ВНОСИТСЯ В НАЧАЛЕ КАЖДОГО МЕСЯЦА ВПЕРЕД по адресу: МИНСК, ВСЕКОБАНК, тек. счет № 682.
Подробные условия высылаются за 2 восьмикопеечные марки. С запросами обращаться: Минск, Всекобанк, заочным курсам.

Глаўлітбел 302. 1-я дзяржаўная друкарня